Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛІПЕНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 127
(26240)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Фота БЕЛТА.

У ВІЦЕБСКУ ЖЫВУЦЬ ФЕСТЫВАЛЕМ

Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ўрачыста адкрыецца толькі сёння — 11 ліпеня, але па добрай традыцыі яшчэ да афіцыйнага адкрыцця пачынаюцца фестывальныя падзеі. Вось учора ў Летнім амфітэатры распачаўся фестывальны «марафон» мастацтваў, што будзе доўжыцца на працягу 10 фестывальных дзён. За гэты час толькі ў амфітэатры ўбачаць самыя розныя канцэртныя праграмы 150 тысяч чалавек.

(Заканчэнне на 7-й стар.)

Парламенцкія выбары ў Беларусі павінны прайсці максімальна адкрыта, дэмакратычна і празрыста

У аснову павінны быць пастаўлены прынцыпы безумоўнага выканання заканадаўства ўсімі ўдзельнікамі выбараў, забеспячэнне парадку і сацыяльна-палітычнай стабільнасці ў грамадстве. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 ліпеня на нарадзе па актуальных пытаннях правядзення парламенцкіх выбараў.

У рэспубліцы прыняты неабходныя дакументы, якія вызначаюць працэдуру правядзення выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу і адпавядаюць міжнародным стандартам, назначана і дата правядзення выбараў — 28 верасня. Як падкрэсліў Прэзідэнт, парламенцкія выбары павінны прайсці строга па Канстытуцыі і законах Беларусі, у якіх ёсць і дэмакратызм, і празрыстасць.

«Трэба памятаць, што выбары праводзяцца не для Захаду і Усходу, а для нас, нашай краіны, нашага народа, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Наш народ павінен вызначыцца, хто будзе ў парламенце, і не трэба пазбаўляць яго гэтага права і тым самым яго прыніжаць».

На думку Прэзідэнта, няма гарантый, што нават пры ідэальным правядзенні выбараў не паступяць папрокі з боку Захаду. «Але мы павінны гэта зрабіць для сябе», — падкрэсліў ён, звяртаючыся да ўдзельнікаў нарады.

«Усім кандыдатам неабходна забяспечыць роўны доступ да СМІ, каб нас потым не папракалі, што мы адным стварылі спрыяльныя ўмовы, а іншым — неспрыяльныя. Так званыя апазіцыянеры сёння чакаюць, каб улада на іх дзесьці пачала націскаць, таму што самі яны не пройдуць. Але ім жа трэба спонсарам растлумачыць, чаму яны не прайшлі. Іх народ і так не прыме. Але вы стварыце ўмовы, роўныя для ўсіх», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна забяспечыць шырокі доступ кандыдатаў да выбаршчыкаў. «Людзі не дурныя, яны ва ўсім разбяруцца... Нашы «свядомыя», так званыя апазіцыянеры, якія рвуцца ва ўладу, нідзе не працуюць, а жывуць лепш за ўсіх у рэспубліцы. Але калі ты працуеш, калі ўмееш працаваць, я ўпэўнены — народ цябе падтрымае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што ў грамадстве не трэба нагнятаць сітуацыю і аказваць якінебудзь націск як на кандыдатаў у дэпутаты, так і на выбаршчыкаў.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ніхто не будзе перашкаджаць і рабоце міжнародных наглядальнікаў. «Назіраць, глядзець, задаваць пытанні, падказваць і крытыкаваць нікому не забаронена, але ўмешвацца ў выбарчы працэс і парушаць закон нікому не будзе дазволена. Парадак на выбарчых участках у гэты перыяд павінен быць ідэальны», — папярэдзіў Прэзідэнт.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЯЦЧУКА.

ДАВЫДЫ ДАВЫД-ГАРАДОЦКІЯ

Патрыятычны ўздым жыхароў Давыд-Гарадка пачаўся неўзабаве пасля юбілейнага 900-годдзя населенага пункта. Цяпер тут жыве амаль дзесятак хлопчыкаў з імем у гонар славутага князя Давыда. Шасцярых з іх сабраў каля аднаго з сімвалаў горада наш фота карэспандэнт.

Вось яны — нашчадкі князя і будучыня горада: чатырохгадовы Давыд ПЯТРОЎ і пяцігадовы Давыд ШПАКЕВІЧ, васьмігадовыя Давыд ЦЯЦЮРА і Давыд САЎЧАНЧЫК, дзесяцігадовы Давыд ЦАРЫК і самы маленькі, якому толькі пазаўчора споўніўся 1 год, Давыд ГАЛАВАЧ.

Прэзідэнт назначыў...

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў палкоўніка Ігара Бахматава начальнікам Інстытута нацыянальнай бяспекі Беларусі, вызваліўшы яго ад пасады начальніка ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Брэсцкай вобласці. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 10 ліпеня.

...і прысвоіў званне

Прэзідэнт Беларусі прысвоіў чарговае воінскае званне генерал-маёра палкоўнікам Сяргею Бобрыкаву, Івану Каржу, Міхаілу Пузікаву і Мікалаю Смаленскаму. Указы аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 10 ліпеня.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ЗАРПЛАТА НА... ЗВОЛЬНЕНЫХ РАБОТНІКАЎ

На працягу чатырох гадоў цяпер ужо былы бухгалтар Гродзенскага шклозавода налічвала зарплату на... звольненых работнікаў. Прадпрыемству прычынены каласальныя страты — больш за 240 мільёнаў рублёў. Ільвіная частка гэтых сродкаў была прысвоена асабіста бухгалтарам.

Садзейнічанне супрацоўнікам АБЭЗ Кастрычніцкага РАУС г. Гродна было аказана кіраўніцтвам завода, «Белпрамбудбанк» прадаставіў звесткі аб праведзеных аперацыях па картрахунках, некаторыя з якіх належалі работнікам прадпрыемства.

Шэрагу фігурантаў па гэтай крымінальнай справе ўжо прад'яўлена абвінавачанне па фактах крадзяжоў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, з астатнімі працуе следства.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МЯНЦЮК ХАВАЎСЯ Ў МАСКВЕ...

Раман Мянцюк, які на трасе «Мінск—Мікашэвічы» пратараніў «жывую заслону», а пасля таго, як у дачыненні да яго была ўзбуджана крымінальная справа знік, затрыманы. Яго разам з жонкай Вольгай супрацоўнікі беларускай міліцыі разам з расійскімі калегамі адшукалі ў Маскве, куды ён прыехаў з Нарафамінска, каб працаўладкавацца.

Нагадаем, што Мянцюк, які не меў вадзіцельскага пасведчання, 2 сакавіка сеў за руль «Фольксвагена-Гольф» п'яным і на хуткасці 160 кіламетраў у гадзіну пратараніў тры машыны, у салоне якіх знаходзіліся вадзіцелі і пасажыры. На шчасце, тады абышлося без смяротных ахвяраў, але 5 чалавек пацярпелі.

Між іншым, Мянцюк і да гэтага рэзанансная здарэнне меў непрыемнасці з законам. У прыватнасці, быў пазбаўлены вадзіцельскага пасведчання за кіраванне аўто ў нецвярозым стане. Акрамя таго, ён адбываў пакаранне за крадзеж, угон, хуліганства. Калі ж «гора-вадзіцель» знаходзіўся ў вышуку, у дачыненні да яго была ўзбуджана яшчэ адна крымінальная справа: падазраецца Мянцюк у тым, што абакраў у Гомелі сваю былую сяброўку. На момант вёрсткі гэтага нумара было вядома, што ў Маскве вырашаецца пытанне аб экстрадыцыі Мянцюка ў Беларусь. Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, учора ён быў дастаўлены ў суд і пэўнае рашэнне павінна быць прынята ў бліжэйшы час. Што ж датычыцца яго жонкі, то яна пакуль адпушчана. Справа ў тым, што таго артыкула, па якім яна абвінавачваецца ў нездаволенай перадачы кіравання транспартным сродкам асобе, якая знаходзіцца ў нецвярозым стане, у расійскім заканадаўстве няма.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

«ГАЗПРАМ» ЗНОЎ ГУЛЯЕ НА НЕРВАХ ЕЎРАПЕЙЦАЎ

Падчас рабочага візіту ў Лівію старшыня праўлення «Газпрама» Аляксей Мілер прапанаваў лівійскім уладам перспектыву — набываць усю нафту і газ, прызначаныя для экспарту з краіны, па канкурэнтных цэнах.

Прапановы аб закупах газу з мэтай наступнага перапродажу будуць зробленыя і іншым вытворцам гэтага паліва, мяркуюць эксперты.

Такім чынам, «Газпрам», які заўсёды публічна сумняваўся ў магчымасці і мэтазгоднасці стварэння газавай картэлі, спрабуе ўзяць пад свой кантроль як мага больш экспартных плыняў у ЕС.

Мэта цяперашніх дэманстратыўных перамоў з Лівіяй і Іранам, лічаць эксперты, — зрабіць еўрапейцаў больш згодлівымі ў пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва і знізіць ціск на расійскія экспартныя праекты («Паўночная плынь» і «Паўднёвая плынь»).

РАЙС ПАПРАСІЛІ ЗАБРАЦЬ СААКАШВІЛІ З КРАІНЫ

Вашынгтон падтрымлівае тэрытарыяльную цэласнасць Грузіі, заявіла дзяржсакратар ЗША Кандаліза Райс на сустрэчы з грузінскім прэзідэнтам Міхаілам Саакашвілі ў Тбілісі. Саакашвілі, у сваю чаргу, заклікаў Расію паважаць суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць Грузіі, падкрэсліўшы, што «Грузія — маленькая, але ганарлівая краіна». Пасля завяршэння прэс-канферэнцыі дзяржсакратар ЗША пакінула Тбілісі і вылецела ў Сафію.

Райс прыбыла з афіцыйным візітам у Грузію на фоне росту напружанасці ў зонах канфліктаў з Абхазіяй і Паўднёвай Асеціяй. Перад сустрэчай з Саакашвілі яна сустрэлася з лідарамі грузінскай апазіцыі, якія паскардзіліся на прыцясненне свабоды слова ў Грузіі і папрасілі забраць Саакашвілі з краіны.

ВА ЎЗБЕКІСТАНЕ ВЫБУХНУЛІ ВАЕННЫЯ СКЛАДЫ: ГОРАД ЭВАКУЯВАНЫ

У горадзе Каган на захадзе Узбекістана ў выніку моцнага пажару выбухнулі склады з артылерыйскімі снарадамі.

Насельніцтва горада эвакуявана. МНС Узбекістана афіцыйна паведаміла аб трох загінулых і 21 пацярпелым. Наступствы выбуху ліквідуюць. Уначы ў горадзе арудавалі марадзёры, а мясцовыя жыхары паведамляюць пра больш за сотню пацярпелых.

белагропромбанк
традиции будущего

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2008 года *(в миллионах белорусских рублей)*

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1	166 282,5	95 051,0
3	Средства в Национальном банке	1102	2	306 205,9	79 780,7
4	Ценные бумаги:	1103		420 596,5	589 730,7
	для торговли	11031	3	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	3.1	—	—
	в наличии для продажи	11033	3.2	420 596,5	589 730,7
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4	83 642,0	140 895,3
6	Кредиты клиентам	1106	5	9 037 072,0	5 231 723,1
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	6	16 662,6	4 447,8
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	7	305 504,6	229 673,7
9	Прочие активы	1109	8	54 504,2	26 132,4
10	**ИТОГО активы**	110		10 390 470,3	6 397 434,7
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202	9	773 422,7	582 808,2
13	Кредиты и другие средства банков	1205	10	1 627 413,6	1 079 703,8
14	Средства клиентов	1206	11	5 366 208,8	2 768 943,0
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		252 710,5	44 274,8
16	Прочие обязательства	1209	12	67 833,6	40 288,8
17	**ВСЕГО обязательства**	120		8 087 589,2	4 516 018,6
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	13	1 878 634,0	1 578 635,0
20	Эмиссионный доход	1212		—	—
21	Резервный фонд	1213		41 861,8	30 726,0
22	Накопленная прибыль	1214	14	206 204,5	118 206,0
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	15	176 180,8	153 849,1
24	**ВСЕГО капитал**	121		2 302 881,1	1 881 416,1
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	12		10 390 470,3	6 397 434,7
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	16	8 467 923,3	4 409 647,1
28	Обязательства	1302	17	1 832 373,6	996 369,1

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ
на 1 июля 2008 года *(в миллионах белорусских рублей)*

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2008 г.	2007 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		422 225,0	301 822,7
2	Процентные расходы	2012		284 085,6	182 183,5
3	Чистые процентные доходы	201	18	138 139,4	119 639,2
4	Комиссионные доходы	2021		81 496,4	64 082,9
5	Комиссионные расходы	2022		5 697,5	4 535,4
6	Чистые комиссионные доходы	202	19	75 798,9	59 547,5
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	20	25 653,5	9 558,8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	21	157,5	(-878,8)
9	Доход в форме дивидендов	205		80,6	21,1
10	Чистые отчисления в резервы	206	22	29 514,6	43 176,8
11	Прочие доходы	207	23	12 373,4	8 659,9
12	Операционные расходы	208	24	144 062,6	107 926,6
13	Прочие расходы	209	25	5 606,7	3 790,0
14	Налог на прибыль	210		22 988,9	11 394,7
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ОТЧЕТНОГО ГОДА	2		50 030,5	30 259,6

И.о. Председателя Правления **В.И. Подковыров**
Главный бухгалтер **М.А. Шаповалова**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА
136 (звонок бесплатный на территории РБ), (017) 218 57 77,
8 029 1 985 777 (Velcom), 8 025 9 185 777 (БеСТ), 8 029 8 885 777 (МТС).
г. Минск, проспект Жукова, 3
Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2. УНП 100693551.

ISSN 1990 - 763X
08127
9771990763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.07.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 121,00
1 еўра	3 335,80
1 латвійскі лат	4 747,62
1 літоўскі літ	966,18
1 чэшская крона	142,31
1 польскі злоты	1019,00
1 расійскі рубель	90,50
1 украінская грыўня	461,19

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	23,4363
10 UAH	50,7279
1000 BYR	11,0263
EUR	36,8747

Курс у гандлёвых кампаніях (на 10.07.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ГАЛАСУЮЧЫХ НАГАМІ БУДЗЕ НЯШМАТ

Спецыяльна для «Звязды»

Ва ўсякім разе паводле прагнозаў Цэнтрвыбаркама

Выбары — гэта заўсёды свята. Для дзяцей дык дакладна. Гэта сапраўдная ўрачыстасць, ва ўсіх прыўзняты настрой, ты ідзеш разам з бацькамі і адчуваеш сябе ўдзельнікам чагосьці вельмі важнага і сур'ёзнага. Асабліва калі чынна апусціш даверануюю табе паперу ў здаравенную скрыню. А пасля чакае самае прыемнае — пачастунак. Што можа быць цудоўней для малога? Прыкладна такія ж уражанні ў свой час былі і ў сённяшняй старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ:

— Мы хадзілі на выбары ўсёй сям'ёй. Мне заўсёды даставалася пірожнае і бутэлька ліманаду! Таму для дзяцей гэта было сапраўднае задавальненне. І я не разумею, чаму бацькі сёння абураюцца, калі настаўнікі, што працуюць ва ўчастковых камісіях, праз дзяцей запрашаюць бацькоў на выбары. Іх жа не на паўлітра завуць, а на выбарчы ўчастак — што ў гэтым крамольнага? Ды і дзяцей тым самым прывучаюць да дэмакратычных стандартаў. Да таго ж гэта выдатная магчымасць для грамадзян сумесна паўдзельнічаць у дэмакратычнай працэдуры, сустрэцца са знаёмымі, якіх даўно не бачылі. Менавіта такія моманты яднаюць нацыю.

Тым не менш, актыўнасць сённяшніх выбаршчыкаў, на думку старшыні Цэнтральнай камісіі, цалкам залежыць ад кандыдатаў:

— Захоча выбаршчык аддаць за некага свой голас або «прагаласуе» нагамі — увогуле не прыйдзе на ўчастак. Акрамя асобаў саміх кандыдатаў, мае значэнне і сезонны фактар. Выбары прыпадаюць на «аксамітны сезон» — у гэты час турэцкія і егіпецкія пляжы перапоўненыя нашымі турыстамі, і ніхто з узбяржэжка не паедзе ў пасольства галасаваць. Таму колькасць выбаршчыкаў вагаецца ў межах сямі мільёнаў. Упэўнена, што каля 60 працэнтаў з'явяцца. Зразумела, лічбы будуць рознымі ў той ці іншай мясцовасці. Мінчан, мабыць, будзе крыху больш за 50 працэнтаў. Тутэйшы выбаршчык больш патрабавальны і пры гэтым менш адказны і менш актыўны. Затое ў сельскай мясцовасці выбаршчыкі ў нас залатыя, хоць яны адны і не могуць «выцягнуць» парламенцкія выбары. Наогул выбаршчыкі сёлета мяне парадавалі яшчэ да абвяшчэння самой кампаніі. Паводле сацыялагічных апытанняў, наш выбаршчык неабыякавы, ён цікавіцца палітыкай. Больш як палова апытаных ведае аб тым, што выбары маюць адбыцца. І большая частка з тых, хто ведае, выказалі намер прыйсці.

Фота БЕЛТА.

Лідзія Ярмошына нагадала таксама, што ў выпадку неактыўнасці выбаршчыкаў давядзецца правозіць паўторныя выбары — а гэта дадатковыя сродкі, работа выбарчых камісій і палітычнае напружанне ў грамадстве...

ДУХ СПАБОРНІЦТВА

— Мы разлічваем, што сёлетняя выбарчая кампанія будзе больш яркай, цікавай, з большай колькасцю ўдзельнікаў і сапраўдным духам спаборніцтва, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Спадзяёмся, гэта будуць не проста «статысты». Для поспеху трэба быць ужо дастаткова вядомай персонай. Відавочна, што ніякі эфірны час, прадастаўлены Цэнтральнай камісіяй, і ніякія плакаты, ёю прафінансаваныя, не змогуць зрабіць з малавядомай асобы гэткую піяр-персону.

Пры гэтым старшыня Цэнтрвыбаркама паскардзілася на тое, што ў выбарах нярэдка ўдзельнічаюць людзі, не знаёмыя з адпаведным заканадаўствам, якія не маюць нават уяўлення аб парадку вылучэння і чакаюць, што Цэнтральная камісія стане іх паліттэхнолагам. Таму патэнцыйным кандыдатам — на заметку:

— Цэнтральная камісія дае адказы на канкрэтныя пытанні, якія з'явіліся ў кандыдатаў пасля азнаямлення з заканадаўствам. Аднак прапісаць кожны крок перадвыбарнай праграмы мы не ў стане і не абавязаны. Такой дэталёвай асветніцкай работай мы займаемся выключна з выбарчымі камісіямі, распрацоўваем для іх метадычныя дапаможнікі.

ДРУКАВАЦЬ ЛІСТОЎКІ — ВЫКЛЮЧНА НА РАДЗІМЕ

У выбарчым заканадаўстве з'явіліся змены, але, як адзначыла Лідзія Ярмошына, яны не носяць канцэптуальны характар і выбаршчыкі наўрад ці наогул адчуюць іх:

— Сёе-тое мы спрасцілі. Скажам, парадак збору подпісаў у сельскай мясцовасці. Недзе ўзмацнілі адказнасць кандыдатаў. Напрыклад, цяпер яны адказныя за дзейнасць сваіх ініцыятыўных груп. Раней гэта было лазейкай для нядобрасумленных кандыдатаў. Натуральна ж, кандыдат «дырыжыруе» выбарчай кампаніяй, у тым ліку і работай ініцыятыўнай групы, чаму ж яму не несці за гэта адказнасць? Перадвыбарныя сходы на адкрытых пляцоўках цяпер будуць праводзіцца ў тым парадку, што прадугледжаны законам аб масавых мерапрыемствах. Уведзена забарона на атрыманне замежнай матэрыяльнай дапамогі. Парушальнікі будуць знятыя з рэгістрацыі. Уся друкаваная прадукцыя ў падтрымку кандыдата павінна быць выпушчана на тэрыторыі Беларусі. Таму што калі матэрыялы вырабляюцца за мяжой, нават у суседняй Расіі, цяжка высветліць крыніцы іх фінансавання і тыраж.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЗАТРЫМАНЫ АЎТАР ІЛЖЭВЫБУХУ

Праваахоўнікамі затрыманы жыхар Віцебскай вобласці, які размясціў у Інтэрнэце несапраўдную інфармацыю аб магчымым выбуху ў Мінску.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, інфармацыйную «бомбу» ён запусціў 8 ліпеня на адну са старонак расійскага сайта знаёмстваў. Прычым аўтар паведамлення зрабіў усё магчымае (на яго погляд), каб застацца невядомым, не даў ніякіх звестак і аб дакладным месцы мяркуемага выбуху. Тым не менеў беларускімі праваахоўнікамі разам з расійскімі калегамі былі прыняты неабходныя меры, каб устанавіць асобу аўтара гэтай інфармацыі. На падставе данага факта ўзбуджана крымінальная справа па ч. 1 арт. 340 КК — «заведама несапраўднае паведамленне аб небяспецы», санкцыі якой прадугледжваюць максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да пяці гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

Острошицкий сельский исполнительный комитет (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Логойском р-не: д. Мончаки — участок пл. 0,1528 га, начальная цена – 1 467 270 рублей; четыре участка в д. Чуденичи: уч. №№ 1, 2 пл. по 0,1357 га, начальная цена – 2 725 410 рублей каждого; уч. №№ 3, 4 пл. по 0,1923 га, начальная цена – 3 862 170 рублей каждого; аг. Острошицы уч. № 1 пл. 0,1201 га, начальная цена – 2 932 000 рублей. На всех участках рядом имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Победитель аукциона обязан возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации: д. Чуденичи, аг. Острошицы – 1 396 714 рублей каждый, д. Мончаки – 1 108 030 рублей. Задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата за земельный участок должна быть произведена в течение 8 рабочих дней после утверждения протокола. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 01.08.2008 г. в 11.00 по адресу: Логойский р-н, аг. Острошицы, Острошицкий сельисполком.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 31.07.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенных в доход государства объектов недвижимости, расположенных по адресу: г. Копыль, ул. Тимковичская, в том числе: здание цеха ЖБИ (общ. пл. 1181,7 кв.м) с мостовым краном КМ-5, компрессорная (общ. пл. 78,8 кв.м) и котельная (общ. пл. 82 кв.м). Начальная цена 377 463 579 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.04.2008 г. **Аукцион состоится 22.07.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Копыль, пл. Ленина, 6 (актовый зал).** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 21.07.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327.
Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания конторы торговой базы, об. пл. 227,6 кв.м, расположенного по адресу: г. Любань, ул. Кирова, 90. Начальная цена снижена на 10 % и составляет – 69 926 400 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2008 г. **Аукцион состоится *29.07.2008 г.* в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявление на участие и необходимые документы принимаются по ***28.07.2008 г.*** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

Грошы

«ВІЛКА» ДЛЯ ЎРАЧА

Сумяшчальніцтва ў медыцыне павінна страціць прывабнасць

У Беларусі распрацоўваецца новая сістэма аплаты працы работнікаў аховы здароўя. Пры гэтым новаўвядзенне мае адразу некалькі мэтаў — «прывязаць» заробкі да вынікаў работы, вярнуць у галіну высокакваліфікаваных спецыялістаў, пазбавіцца цяперашняй практыкі залішніх перапрацовак, і ў рэшце рэшт, павысіць саму якасць медыцынскіх паслуг. Зрэшты, падрабязней аб гэтым — наша гутарка з дырэктарам Навукова-даследчага інстытута працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святланай Васільеўнай ШАЎЧЭНКА.

— Сярод медыкаў папулярны такі жарт: калі працуеш на стаўку, то есці няма чаго, а калі працуеш на паўтары стаўкі, то есці няма калі. Наколькі ён адпавядае рэчаіснасці?

— На жаль, у гэтым жарце ёсць вялікая доля праўды. Статыстыка сведчыць, што ў красавіку сярэдняя зарплата беларускага ўрача складала каля 1128 тыс., а работніка сярэдняга медыцынскага персаналу — 655 тыс. рублёў. На першы погляд, лічбы падаюцца не самымі кепскімі, асабліва калі ўзяць пад увагу рашэнне аб павышэнні заробкаў работнікам галіны ў ліпені. Аднак трэба адзначыць — не ў апошнюю чаргу падобныя вынікі атрымліваюцца за кошт павелічэння інтэнсіўнасці працы. Інакш кажучы, цяперашнія паказчыкі зарплаты ў вялікай ступені фарміруюцца за кошт дадатковых ставак, «лішніх» дзяжурстваў, перапрацовак.

Заканадаўства вызначае, што з-за спецыфікі і складанасці работы медыкі маюць права на скарочаны працоўны тыдзень. Але мы зрабілі аналіз і прыйшлі да несуцяшальнай высновы, што на справе перагэтага не выконваецца. Скажу нават больш: па колькасці адпрацаваных гадзін кожным «сярэднім» работнікам медыцына саступае толькі адной галіне — сельскай гаспадарцы.

І прычына тут відавочная. У сітуацыі, калі праца ўрача пры нармальнай загрузцы «каштуе» менш, чым праца нізкакваліфікаванага рабочага ў прамысловасці, большасць медыкаў імкнецца «набраць» зарплату за кошт павелічэння аб'ёмаў работы. А ў сваю чаргу гэта адбіваецца на якасці медыцынскага абслугоўвання.

— Адразу ўзнікае пытанне: ці ёсць тут выйсце?

— Выйсце ў змяненні самой сістэмы аплаты працы медыцынскіх работнікаў, і асноўным у гэтай сістэме павінен стаць прынцып — больш высокая зарплата за больш складаную працу.

Мы ўважліва вывучылі замежны вопыт і канстатавалі, што ў Еўропе апошнія паўстагоддзя пры пабудове сістэмы аплаты абавязкова праводзіцца папярэдняя ацэнка складанасці працы работнікаў. Падобную работу ў рамках інавацыйнага праекта распачаў і наш інстытут. Па-першае, пры ацэнцы складанасці плануецца ўлічваць такія фактары, як кваліфікацыя, узровень адукацыі, стаж, адказнасць за прыняцце рашэнняў адносна пацыента, матэрыяльная адказнасць, складанасць вырашаемых праблем, ступень камунікацыйнасці, санітарна-гігіенічныя ўмовы працы, цяжкасць працы. А па-другое, неабходна ўзяць пад увагу: работа на адной і той жа пасадзе істотна адрозніваецца ў розных тыпах медыцынскіх устаноў.

Далей жа схема выглядае прыкладна так. На падставе гэтай ацэнкі ўсе пасады медыцынскіх работнікаў ёсць намер аб'яднаць у групы з прыкладна аднолькавым узроўнем аплаты працы. У цэлым такіх груп можа быць 12—13, і ў тым ліку 8—9 — для ўрачоў. Калі ўзгадаць, што зараз тыя ж урачы «адрозніваюцца» ўсяго на 1—2 тарыфныя разрады, мы забяспечваем большую дыферэнцыяцыю ў заробках у залежнасці менавіта ад складанасці працы.

Але галоўнае нават не гэта. Прапануецца, што кожная з груп па аплаце працы павінна адпавядаць не якому-небудзь аднаму канкрэтнаму значэнню тарыфнага каэфіцыента — для кожнай групы патрэбна закласці «вілку», інтэрвал заробку з пэўнай ніжняй і верхняй кропкай. Прычым медыкі

Усе пасады медработнікаў ёсць намер аб'яднаць у групы з прыкладна аднолькавым узроўнем аплаты працы. У цэлым такіх груп можа быць 12—13, і ў тым ліку 8—9 — для ўрачоў. Пры гэтым кожная з груп па аплаце працы павінна адпавядаць не якому-небудзь аднаму канкрэтнаму значэнню тарыфнага каэфіцыента — тут будуць закладзены «відэльцы», інтэрвалы заробку з пэўнай ніжняй і верхняй кропкай.

на адной і той жа пасадзе павінны размяркоўвацца па гэтым інтэрвале ў залежнасці ад якасці сваёй работы.

У выніку ўвядзення інтэрвалаў знікне неабходнасць шукаць дадатковую нагрузку. Кожны прадстаўнік аховы здароўя павінен убачыць: цяперашнія ці нават большыя грошы можна атрымліваць без сумяшчальніцтва і перапрацовак, а на адным месцы і ў нармальным рэжыме работы. Словам, стане выгадна зарабляць не аб'ёмамі, а зноў-такі якасцю. Пры гэтым у выйгрышы тут павінны аказацца не толькі медыкі, а ўсе грамадзяне Беларусі — у рэшце рэшт, узровень дапамогі ў паліклініках ці бальніцах вызначае і працягласць жыцця, і паказчыкі смяротнасці, і дэмаграфічную бяспеку краіны ў цэлым.

— Якой будзе розніца ў аплаце ў межах аднаго інтэрвалу?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Пакуль называць канкрэтную розніцу ў аплаце яшчэ рана, гэта пытанне вывучаецца, да таго ж кожная група медработнікаў будзе мець свой дыяпазон. Мы лічым, што разбежка паміж ніжняй і верхняй планкай павінна быць не менш за 30 працэнтаў.

— Дарэчы, наконт мінімальнай планкі. Ці можна казаць, што аплата працы па ёй будзе не меншай за цяперашнія паказчыкі?

— Адназначна. Ніводны з медработнікаў (незалежна ад таго, у якую групу ён патрапіць) не павінен атрымліваць менш, чым цяпер і да таго ж — пры нармальнай нагрузцы.

— Удакладнім: атрымліваць не менш у улікам сённяшніх даплат, павышэнняў і надбавак?

— У новай сістэме мы прапануем асобна пакінуць толькі даплаты, вызначаныя Працоўным кодэксам (за работу ў выхадныя дні, у сельскай мясцовасці, у начны час і г.д.) і іншыя кампенсацыйныя выплаты — скажам, за работу ў зоне радыяцыйнага забруджвання. Адпаведна, усе астатнія даплаты за спецыфіку і асаблівасць працы (паўтараруся: без зніжэння агульнага памеру заробкаў) увойдуць у тарыфную частку. Гэта зробіць структуру зарплаты больш празрыстай. І, апроч таго, дасць яшчэ адзін плюс, бо не будзем забывацца, што тарыфная частка зарплаты — гэта частка гарантаваная. А яна ў медработнікаў стане не больш важкай.

— Ці не самы цікавы нюанс. Хто будзе вызначаць, аднесці работніка да верхняй або да ніжняй планкі інтэрвалу заробкаў?

— Гэта павінна вызначацца камісіяй па месцы працы. Прычым

каб выключыць верагоднасць суб'ектыўнасці, мы распрацуем пэўную сістэму ацэначных паказчыкаў для кожнай пасады і кожнага тыпу медыцынскіх устаноў, а ў сваю чаргу ў медустанове будзе весціся ўлік выніковасці работніка.

— Вядома, што адна з праблем цяперашняй медыцыны — недахоп кадраў. Часта гэта праблема вырашаецца дзякуючы сумяшчальнікам. Ці не прывядзе новая сістэма аплаты, калі сумяшчальніцтва страціць прывабнасць, да ўскладнення сітуацыі?

— Мы разлічваем, што новая сістэма аплаты дазволіць утрымаць на сваіх месцах цяперашніх работнікаў, прыцягнуць новых людзей, а таксама вярнуць у галіну спецыялістаў, якія пакінулі яе раней. І, спадзяёмся, менавіта такім чынам будзе вырашана пытанне «незакрытых вакансій».

— Тым часам, калі ў медыцыне можа запрацаваць новая мадэль зарплаты?

— Наш інстытут распрацуе новую мадэль сёлета, надалей, у першым паўгоддзі наступнага года яна абавязкова павінна прайсці апрабацыю ў медыцынскіх установах, трэба, каб новаўвядзенні падтрымала Міністэрства аховы здароўя, неабходна распрацаваць адпаведную дакументацыю. Таму назваць канкрэтную дату можна ўмоўна — магчыма, гэта будзе 2010 год.

— І апошняе. Якая верагоднасць таго, што практыка аплаты ў звязцы са складанасцю працы будзе ўведзена і ў іншых бюджэтных галінах?

— Такая верагоднасць існуе. Аднак для гэтага неабходна распрацаваць сваю методыку ацэнкі складанасці працы, скажам, асобна для той жа адукацыі, культуры і іншых галін.

Сяргей ГРЫБ.

ЯК ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА СРОДКІ?

Сёння ў Мінску праходзіць сумеснае пасяджэнне калегій Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь і Падліковай палаты Расійскай Федэрацыі пад старшынствам кіраўнікоў вышэйшых кантрольных ведамстваў Зянона ЛОМАЦЯ і Сяргея СЦЯПАШЫНА.

На пасяджэнні разглядаецца аператыўная справаздача аб ходзе выканання бюджэту Саюзнай дзяржавы за I квартал 2008 года. Таксама ўдзельнікі сумеснага пасяджэння абмяркоўваюць вынікі праверкі мэтавага выкарыстання сродкаў бюджэту Саюзнай дзяржавы на рэалізацыю праграмы першачарговага развіцця мытнай інфраструктуры пагранічных пунктаў мытнага афармлення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а таксама сумесных праграм і мерапрыемстваў, звязаных з развіццём дызельнага аўтамабілебудавання, павышэннем эфектыўнасці вытворчасці і перапрацоўкі плодаагароднінай прадукцыі на аснове прагрэсіўных тэхналогій і тэхнікі.

БЕЛАРУСЬ І ФРАНЦЫЯ: ПАЛІТЫКА ДОБРАСУСЕДСТВА НЕ ВЫКЛЮЧАНАЯ...

...пры ўмове правядзення адкрытых і свабодных парламенцкіх выбараў

Аб гэтым паведаміла журналістам пасол Францыі ў Беларусі Мірэй Мюсо падчас сустрэчы з нагоды Нацыянальнага свята краіны і яе старшынства ў Савеце Еўрапейскага саюза.

— Правядзенне выбарчай кампаніі ў Беларусі стане знакам для прыняцця нашых рашэнняў. І калі ўсё будзе развівацца так, як кажуць беларускія ўлады, якія шматразова заяўлялі аб тым, што будучыя выбары будуць праходзіць ясна, празрыста і адкрыта, то мы зможам перайсці да новай дынамікі ў адносінах Беларусі і Еўрапейскага саюза.

«Мне вельмі хацелася б, каб гэта адбылося падчас старшынства Францыі ў Савеце ЕС», — адзначыла спадарыня пасол. Яна падкрэсліла, што важна не толькі тое, як будзе праходзіць выбарчая кампанія непасрэдна ў дзень галасавання і якімі будуць вынікі, але і ход выбарчай кампаніі ў цэлым.

Сярод крытэрыяў ацэнкі выбараў спадарыня Мюсо назвала роўныя магчымасці для рэгістрацыі кандыдатаў (незалежна ад іх палітычных поглядаў), доступу іх да СМІ і сустрэч з выбаршчыкамі. Яна таксама адзначыла важнасць таго, каб ва ўдзельнікаў выбарчай кампаніі былі аднолькавыя фінансавыя магчымасці, каб пры гэтым не выкарыстоўваўся адміністрацыйны рэсурс. Яшчэ адным ключавым крытэрыем з'яўляецца склад выбарчых камісій — ці ўключаны ў іх прадстаўнікі розных палітычных накірункаў. Завёўшы размову пра магчымасці назірання за выбарамі, Мірэй Мюсо прыняла французскі вопыт:

— Любы французскі грамадзянін можа прыйсці ў акруговую камісію і паглядзець, як ідуць падлікі. Тут няма ніякіх праблем.

У дачыненні да нашых выбараў спадарыня Мюсо настроена пазітыўна:

— Мы вельмі спадзяёмся на тое, што выбары ў Беларусі сапраўды пройдуць свабодна, справядліва і адкрыта. Паколькі гэта дазволіць нам прасунуцца ў нашых адносінах, у адносінах Беларусі з ЕС і ў цэлым з міжнароднай супольнасцю.

У такім выпадку, на думку Мірэй Мюсо, можна казаць аб магчымасці правядзення Францыяй палітыкі добрасуседства ў дачыненні да Беларусі:

— Яна прадугледжвае не толькі пэўную фінансавую дапамогу, але і сумесныя праекты ў сферы энергетыкі, транспарту, навакольнага асяроддзя.

У Парыжы з нагоды Нацыянальнага свята пройдзе грандыёзны парад. «Некалі супярэчлівы момант стаў цяпер святам нашага адзінства», — рэзюмавала спадарыня пасол. 14 ліпеня ў французскай сталіцы чакаецца мноства ганаровых гасцей.

— На трыбунах сёлета будуць прысутнічаць кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў Міжземнамор'я — як поўдня, так і поўначы. Мяркую, размова ідзе больш чым аб 45 кіраўніках дзяржаў. А госці на пасольскім прыёме ў Мінску змогуць паглядзець урачыстасці ў запісе.

Ала МАЧАЛАВА.

Тэлебачанне — на свой густ. Гэта не фантастыка...

Падключыцца да інтэрактыўнага тэлебачання запрашае мінчан Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белтэлеком».

IPTV — гэта тэлебачанне новага пакалення, якое прадастаўляе магчымасці, аб якіх звычайны тэлеглядач мог раней толькі марыць. Фактычна ўладальнікам IPTV прадастаўляецца ўнікальная магчымасць стварыць тэлебачанне, так бы мовіць, на ўласны густ: самастойна складаць «сваю» сетку вяшчання, глядзець перадачы ў зручны для іх час (функцыя «Тэлебачанне па запыту»), ставіць паўзу, калі трэба напрыклад, выключыць на кухні чайнік ці зрабіць яшчэ штосьці па дому, і «адматаць» тэлеэфір на некалькі дзесяткаў хвілін назад. Ёсць у IPTV і такая функцыя, як «Бацькоўскі кантроль» — гэта магчымасць не дапускаць дзяцей да прагляду перадач і фільмаў, да якіх, па меркаванні бацькоў, малыя яшчэ не дараслі.

Падключыць інтэрактыўнае тэлебачанне зусім проста — для гэтага дастаткова быць абанентам «Белтэлекам» і мець дома звычайную тэлефонную разетку. Сігнал інтэрактыўнага тэлебачання дастаўляецца па звычайных тэлефонных правадах і паступае на тэлевізійны экран праз зручны камплект абсталявання: сплітэр, ADSL-мадэм і Set Top Box — спецыяльную прыстаўку, якая выконвае вашы пажаданні. Прычым адначасова з інтэрактыўным тэлебачаннем працуе і хатні тэлефон, і высокахуткасны доступ у Інтэрнэт. IPTV ужо сёння напоўнена больш чым 20 тэлеканаламі. Для таго, каб падключыцца ў ліку першых да інтэрактыўнага тэлебачання, трэба звярнуцца ў тэлефонны цэнтр абслугоўвання кліентаў па тэлефоне 130 (званок бясплатны), дзе падрабязна раскажуць пра кошт паслугі і парадак яе прадастаўлення. Адзінае, што трэба дадаць, падключыцца да яго могуць толькі фізічныя асобы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА ТЭЛ. 8 (017) 220 20 25

22 ліпеня:

9.00—12.00 — галоўны спецыяліст упраўлення аховы здароўя па анкалогіі Святлана Мікалаеўна СІРЭНКА.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога радзільнага дома Пётр Леанідавіч МАСЬКО.

29 ліпеня:

9.00—12.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Таццяна Фёдараўна МАРТЫНАВА.

14.00 —17.00 — галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы Юрый Мікалаевіч ЛАДУЦЬКА.

5 жніўня:

9.00—12.00 — галоўны ўрач МРЭК Мінскай вобласці Юлія Анатольеўна АЎСЯНІК.

14.00 —17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Людміла Анатольеўна АНДРЭЕВА.

Пяцёра брастаўчан падазраюцца ва ўчыненні незаконных здзелак з нерухомасцю

Следчае ўпраўленне папярэдняга расследавання УУС Брэсцкага аблвыканкама праводзіць расследаванне па крымінальнай справе ў дачыненні да грамадзян, якія займаліся незаконнымі здзелкамі з нерухомасцю.

Як паведаміла старшы следчы па асабліва важных справах следчага ўпраўлення УУС Брэсцкага аблвыканкама Маргарыта Чацвярык, ва ўчыненні супрацьпраўных дзеянняў падазраюцца пяцёра жыхароў Брэста, якія дзейнічалі ў складзе групы. Пад выглядам рыэлтараў яны шукалі патэнцыяльных ахвяраў сваіх махінацый: збіралі поўную інфармацыю пра людзей, якія злоўжывалі спіртнымі напоямі, не мелі блізкіх сваякоў, сістэматычна затрымлівалі аплату камунальных плацяжоў. Сваім кліентам яны прапаноўвалі дапамогу ў продажы кватэр, аплаце запазычанасці па камунальных плацяжах. Аплаціўшы запазычанасць, затраты, звязаныя з прыватызацыяй і продажам, прысвойвалі выручаныя ад продажу нерухомасці грошы, а сваім кліентам купляліў ў большасці выпадкаў непрыдатнае для пражывання жыллё, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, прысвойвалі выручаную ў выніку абмену на меншую кватэру даплату. Дзейнасцю злачынная групы следчыя органы зацікавіліся пасля таго, як у міліцыю звярнуўся адзін з пацярпелых.

Вольга КАБЯК, БЕЛТА.

Абзац

■ **Камісія УП «Гарадскія паркі Мінскзеленбуда» пачала праверку ўсіх атракцыёнаў сталіцы, у тым ліку і тых, якія належаць прыватным прадпрыемствам.**

■ ДТЗ у Пружанскім раёне забрала жыцці двух чалавек. У выніку лабавога сутыкнення на трасе аўтамабіляў «Фольксваген» і «БМВ» загінулі два чалавекі і трое параненых.

■ **За апошнія 10 гадоў аўтапарк у Беларусі павялічыўся на 60 працэнтаў і зараз складае каля 2,5 млн транспартных сродкаў. На чатырох жыхароў рэспублікі прыходзіцца адзін аўтамабіль, а ў Мінску — на трох жыхароў горада. У сувязі з гэтым павялічваецца напружанасць на дарогах і колькасць ДТЗ. Толькі за паўгода ў Беларусі адбылося больш як 33 тыс. ДТЗ, у якіх загінулі 625 чалавек, параненыя 3288. ДАІ прадпрымае меры па скарачэнні аварыйнасці, напрыклад сёлета адноўлена верталётнае патруляванне. Акрамя таго, у наступным годзе плануецца больш маштабна ўкараняць відэафіксацыю парушэнняў.**

■ Продаж спіртнога 16 ліпеня, у «дзень цвярозасці» на «Славянскім базары ў Віцебску», будзе абмежаваны на ўсіх аб'ектах гандлю абласнога цэнтра. Алкаголь будзе рэалізоўвацца ў рэстаранах і кафэ вышэйшай нацэначнай катэгорыі, прычым за продаж «на вынас» прадаўцы будуць несці сур'ёзную адказнасць. Магазіны ў гэты дзень гандляваць спіртным не будуць увогуле.

■ **У Расіі дэпутаты прапаноўваюць абавязаць бацькоў забяспечваць дзяцей жыллём. Гэта павінна быць альбо кватэра для сумеснага пражывання, калі бацькі жывуць разам з дзецьмі, альбо набытае або арандаванае спецыяльна для дзяцей жыллё ў выпадку разводу. Кватэра павінна быць добраўпарадкаванай, плошчай не ніжэй за сацыяльныя нормы, знаходзіцца ў тым жа населеным пункце, дзе дзеці жылі раней. Адзінае абмежаванне — выдаткі бацькі разам з аліментамі не могуць перавышаць палову яго прыбыткаў. У тлумачальнай запісцы гаворыцца, што мэта паправак у закон — абарона няпоўнагадовых дзяцей пасля разводу бацькоў. Паводле дзеючага заканадаўства, суд пры разводзе можа абавязаць мужчыну дазволіць былой жонцы з дзіцем пражываць у яго кватэры нейкі час. Аднак аўтары паправак сцвярджаюць, што на практыцы гэта права рэалізаваць немагчыма.**

■ Раніцай у чацвер у Санкт-Пецярбургу прагулачны катэр сутыкнуўся з крэйсерам «Аўрора». Мужчына, які знаходзіўся на катэры, шпіталізаваны ў цяжкім стане, жанчыне, што суправаджала яго, дапамога была аказана на месцы. Катэр быў адбуксіраваны на стаянку Дзяржінскецкі па маламерных суднах, спецыялісты якой павінны ўстанавіць прычыну аварыі. Водазмяшчэнне крэйсера «Аўрора», як вядома, складае больш за 6700 тон. Для параўнання: водазмяшчэнне прагулачнага катэра не перавышае пяці тон.

Поўны абзац

■ **У Растоўскай вобласці ўстаноўлены помнік у выглядзе жаночых грудзей, на якіх ляжыць мужчынская рука. Помнік, які адчыняць для агляду ў суботу, размясцілі ў гарадскім парку Батайска. Па задуме аўтараў мужчына, які дакранецца да гэтага манумента, знойдзе шчасце ў сямейным жыцці. У будучым каля помніка плануюць устанавіць лаўку закаханых, а таксама абсталяваць «паляну прымірэння» для сямейных пар.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ГАЛАСУЮЧЫХ НАГАМІ БУДЗЕ НЯШМАТ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Увогуле ж старшыня Цэнтральнай камісіі адзначыла ліберальнасць беларускага заканадаўства: «яно адкрывае перад канкрэтнымі людзьмі, якія жадаюць удзельнічаць у выбарах, шырокія магчымасці, каб выбраць сваю канцэпцыю, сваю праграму». Тым не менш мы будзем старацца, каб выбары задавалілі і Еўрасаюз. Гэта важна для эканомікі Беларусі, важна ў плане міжнародных кантактаў, важна, каб наш парламент быў выязным і змог адстойваць інтарэсы Беларусі на міжнародным арэне.

Старшыня Цэнтральнай камісіі дала станоўчую ацэнку нядаўняй сустрэчы з дэлегацыяй прадстаўнікоў ЕС. У прыватнасці, у ёй узялі ўдзел пасол Францыі (краіны, якая цяпер старшынствуе ў Еўрасаюзе) у Беларусі Мірэй Мюсо і начальнік палітычнага аддзела Генеральнага сакратарыята Савета ЕС Хельга Шмідт.

— Сустрэча прайшла, як пісалі раней у хроніках, у цёплай і дружалюбнай атмасферы, — падзялілася ўражаннямі старшыня Цэтрвыбаркама. — Прыемна, калі замежныя госці размаўляюць на роўных і не дыктуюць умоў. Таму гутарка ішла канструктыўна. Уся тая інфармацыя аб ходзе падрыхтоўкі да выбараў, якую мы прадаставілі прадстаўнікам Еўрасаюза, іх задаволіла.

На гэтым тыдні Міністэрства замежных спраў плануе накіраваць запрашэнні міжнародным арганізацыям для ўдзелу іх прадстаўнікоў у выбарах у якасці назіральнікаў. Парламент у сваю чаргу запросіць прадстаўнікоў парламенцкіх структур іншых краін, а Цэнтрвыбаркам накіруе запрашэнні сваім калегам.

— Мы запросім калег пазней — у жніўні, паколькі яны кароткатэрміновыя назіральнікі і прыедуць толькі на перыяд саміх выбараў, — удакладніла Лідзія Ярмошына. — Натуральна, гэта будуць прадстаўнікі тых краін, якія запрашаюць нас, — Літвы, Латвіі і краін СНД. Ацаніць магчымую колькасць назіральнікаў даволі цяжка. Кожная структура сама вызначае, колькі прадстаўнікоў ёй накіраваць. У нас, скажам, не прынята адпраўляць больш за двух прадстаўнікоў ад арганізацыі, а вось паўднёвыя краіны часам накіроўваюць дэлегацыі і па пяць чалавек. Магу сказаць толькі аб місіі АБСЕ: яны паведамілі нам, што плануюць накіраваць у Беларусь 40 доўгатэрміновых назіральнікаў (якія пачнуць працаваць тут яшчэ ў канцы ліпеня — пачатку жніўня) і 300 — кароткатэрміновых. Паколькі звычайна прытрымліваюцца парытэту, то, мяркую, што СНД накіруе столькі ж сваіх прадстаўнікоў. На маю думку, у нас будзе каля 700 міжнародных назіральнікаў. Гэта вельмі шырокае прадстаўніцтва. Для параўнання: у велізарнай Расіі падчас выбараў працавала 300 міжнародных назіральнікаў, а ў Польшчы ўвогуле 20.

«КАЛІ ПАРТЫЯ НЕ ЎДЗЕЛЬНІЧАЕ Ў ВЫБАРАХ, ЯНА БЕЗНАДЗЕЙНАЯ»

Сёння прадстаўнікі палітычных партый могуць узяць удзел у рабоце Цэнтрвыбаркама з правам дарадчага голасу. У свой час гэту ідэю прапанавала менавіта Лідзія Ярмошына:

— Мы запазычылі гэта з расійскага выбарчага заканадаўства. Такая практыка пачалася ў нас яшчэ восем гадоў таму. Праўда, тады яна была крыху ўсечанай: канкрэтныя прадстаўнікі прызначаліся дэкрэтам Прэзідэнта. Пасля мы прадаставілі права выбару самім партыям. Вядома ж, іх удзел — гэта дадатковыя клопаты для Цэнтрвыбаркама, больш канфліктныя пасяджэнні. Затое гэта сапраўдная дыскусія і стымул для партый актыўна ўдзельнічаць у выбарах. А крытыка такой практыкі для многіх — найлепшая абарона ад магчымага пройгрышу. На мінулых выбарах з 18 тады існаваўшых партый сваіх кандыдатаў вылучылі толькі 10. Атрымліваецца, што амаль палова партый — фармальныя, паколькі ўдзел у выбарах — гэта асноўны абавязак партыі, як інакш змагацца за ўладу? Таму калі партыя не ўдзельнічае ў выбарах, яна безнадзейная. Мяркую, што большая частка апазіцыйных партый сёлета будзе прадстаўлена — яны, дарэчы, вельмі актыўна б'юць удзел у выбарах. Таксама актыўна заявілі аб сваім удзеле Партыя працы і справядлівасці, Камуністычная партыя Беларусі. Мяркую, возьме ўдзел і Аграрная партыя — яны актыўна кансультуюцца ў Цэнтральнай камісіі. Пакуль не бачна перадвыбарчай дзейнасці Ліберальна-дэмакратычнай партыі, што само па сабе дзіўна, таму што гэта партыя заўжды ўдзельнічае ў выбарах. Увогуле з 15 існуючых партый, на маю думку, не менш як дзесяць возьмуць удзел у выбарах.

Рэзюмуючы, Лідзія Ярмошына выказалася і аб прыдатнасці айчынай выбарчай сістэмы:

— Мажарытарная сістэма блізкая нашым выбаршчыкам. Адказваючы на пытанне «На што вы звяртаеце больш увагі — на палітычную платформу кандыдата ці на яго асобу?», нашы грамадзяне звычайна выбіраюць другі варыянт.

Нагадаем, што гэты раздзел Канстытуцыі, які мае дачыненне да выбарчай сістэмы, можа быць зменены не толькі шляхам рэферэндуму, але і рашэннем парламента.

Ала МАЧАЛАВА.

Выбаршчык хоча ведаць...

Чытач «Звязды» атрымаў адказы на свае пытанні ад старшыні Цэнтральнай камісіі

Сваю палітычную неабыякавасць праяўляюць і нашы чытачы. А мы іх у гэтым з задавальненнем падтрымліваем. Таму калі ў рэдакцыю прыйшоў допіс, дзе ўзнімаецца шэраг пытанняў наконт выбарчай сістэмы, мы вырашылі не толькі апублікаваць іх, але і атрымаць адказы. З першых крыніц, так бы мовіць. Ліст **пенсіянера з Мінска Рыгора ДАЙНЯКА** мы накіравалі проста старшыні Цэнтрвыбаркама, і Лідзія Ярмошына не адмовіла нам у каментарыі. Сёння мы прапануем вашай увазе вытрымкі з тых пытанняў і адказы на іх:

«Па-першае, чаму гэта мы так учапіліся за шматдзённае галасаванне? Як быццам у нас расійскія прасторы, дзе падоўгу трэба адшукваць пастухоў, аленяводаў, рыбакоў, нафтавікоў і іншых выбаршчыкаў. Хопіць нам і аднаго дня, як ва ўсіх нармальных краінах. Хто хоча прыйсці — прыйдзе, і хопіць яму для гэтага і 12 гадзін».

— Тут няма стандартаў, кожная дзяржава прымяняе ўласныя вопыт і тэхналогіі — тыя, што склаліся ў краіне і прымаюцца выбаршчыкамі. Нам недастаткова 12 гадзін. Многія людзі могуць элементарна дазволіць сабе паехаць на лецішча ў гэты дзень. Мы павінны даваць грамадзянам шырокія магчымасці для ўдзелу ў выбарах, а не звужаць іх. Дарэчы, датэрміновае галасаванне шырока распаўсюджанае ў другіх дзяржавах. У ЗША, напрыклад, у залежнасці ад штата, яно доўжыцца ад 3 да 45 сутак. У нас — 5 сутак.

«Па-другое, з якой мэтай мы так пільна ахоўваем доступ у склад акруговых выбарчых камісій? Фактычна трымаем іх пад замком. Чаго мы баімся? Ну калі ёсць добрахвотнікі, давайце іх уключым, няхай працуюць. Бо дастатковым крытэрыем адпаведнасці тут можа быць культура адносінаў да людзей і ўменне лічыць да адной тысячы, ад сілы да двух. А калі нават і з апазіцыі папросяцца, то няма чаго пужацца, яны такія ж людзі, як і ўсе, і Канстытуцыя ў нас адна на ўсіх. Там таксама ёсць адукаваныя хлопцы і дзяўчаты, няхай папрацуюць і яны».

— Мы не закрываем доступ у акруговыя выбарчыя камісіі, барані Божа! Проста выбарчая камісія — гэта вельмі тонкі і нервовы грамадскі арганізм. Людзі павінны працаваць, скажам так, у адной звязцы. І калі там з'яўляецца нейкі раздражняльнік спакою і нармальнай работы, натуральна, членам камісіі становіцца цяжэй працаваць. Таму адбор туды, скажам, прадстаўнікоў партый, вядзецца вельмі асцярожна. Прычым значэнне маюць нават не іх палітычныя погляды, а стыль грамадскіх паводзінаў. Тым не менш, у гэтую выбарчую кампанію мы рэкамендуем нашым выканаўчым і распарадчым органам максімальна задавальняць заяўкі палітычных партый, у тым ліку і апазіцыйных, аб уключэнні ў склад выбаркамаў.

«Па-трэцяе, трэба ліквідаваць адміністрацыйнае ўздзеянне на акруговыя выбарчыя камісіі. Не павінны выбарчыя камісіі падпарадкоўвацца выканаўчай уладзе».

— А ў чым, на думку выбаршчыка, выражаецца гэта адміністрацыйнае ўздзеянне? У тым, што выканкамы аказваюць дапамогу выбарчым камісіям? Дык яны без гэтай дапамогі проста не змогуць функцыяваць. Гэта ж часовыя грамадскія органы, якія не маюць нічога — ні маёмасці, ні фінансаў. А што датычыцца дыктату ў дачыненні да прыняцця рашэння, камісія кіруецца толькі законам.

«Па-чацвёртае, трэба, каб у краіне была празрыстая выбарчая сістэма, пачынаючы з урнаў для галасавання. Давайце зробім іх з аргшкла. Няхай усе бачаць, што там робіцца і што туды кідаюць. Але што мы, бяднейшыя за Ўкраіну ці за Грузію, якія ўжо карыстаюцца празрыстымі ўрнамі?... Але празрыстасць павінна быць не толькі урнаў, але і інфармацыі аб выбарах. Хоча ведаць назіральнік ці просты выбаршчык, напрыклад, колькі бюлетэняў выпушчана да выбараў з друкарні, — калі ласка. Альбо колькі бюлетэняў пасля выбараў засталося не задзейнічана...».

— Празрыстыя урны не забяспечваюць празрыстасць выбараў. Ды нічога і не бачна на самай справе — бюлетэні там ляжаць ці чыстая папера? Улэўніцца ў гэтым можна толькі ўскрыўшы урну. Празрыстасць выбараў забяспечваецца назіраннем за іх ходам, за падлікам галасоў. Тым не менш, празрыстыя урны ў нас не забароненыя. Больш за тое, яны прымяняюцца ў тых арганізацыях, якія могуць сабе гэта дазволіць. Такім чынам арганізуюцца ўчасткі, напрыклад, у ВНУ. Там, дзе няма сродкаў, стварваюцца мінімальныя ўмовы, якія адпавядаюць, дарэчы, і міжнародным стандартам. Што да Ўкраіны, то па тэлебачанні дэманструюць выбарчыя ўчасткі ў Кіеве, а не якім-небудзь маленькім пасёлку. І хто ведае, як там усё абсталявана? Па ўласным вопыце магу сказаць, што ў Венгрыі для галасавання выкарыстоўваюць звычайныя кардонныя скрынкі. У Польшчы — драўляныя скрыні, такія ж, як у нас. Нядаўна інфармацыі, я лічу, што яе трэба даваць назіральнікам. Я яе ўсю даю — і колькі заказана бюлетэняў, і колькі іх засталося. Дарэчы, усё гэта ёсць і ў пратаколах, якія вывешваюцца для агляду. Адказваць на такія пытанні не забараняецца, аднак гэта і не ўстаноўлена спецыяльна. Часта гэта проста ўзаемаадносіны камісіі і назіральніка.

«Па-пятае, чаму гэта назіральнікам забараняецца прысутнічаць на той «кухні», дзе ідзе падлік галасоў выбаршчыкаў?... Кожнае «нельга» выклікае падазрэнне і ў назіральнікаў, і ў нас, выбаршчыкаў з народа».

— Назіральнікі прысутнічаюць на той «кухні». Міжнародныя назіральнікі нават стаяць за спінамі нашых спецыялістаў, пакуль тыя падсумоўваюць на камп'ютарах атрыманыя вынікі. А нацыянальныя — прыходзяць да нас у дзень выбараў і выказваюць жаданне прысутнічаць у Цэнтральнай камісіі. І ніякай сенсацыі не здараецца — ніхто нічога не фальсіфікуе, за руку схапіць некага.

«Па-шостае, чаму мы не можам для недаверлівых даць магчымасць пералічыць вынікі выбараў у акрузе і нават увогуле? Няхай лічаць і пераканаюцца, і той, і другі, што заслужана засталіся ў пройгрышы. Каб не енчылі потым».

— Падчас кожнай выбарчай кампаніі ў Беларусі ёсць выпадкі, калі галасы пералічваюцца. Аднак гэта не азначае, што падлікамі можа заняцца любы грамадзянін, што прысутнічае на ўчастку. Права на гэта мае вышэйстаячая выбарчая камісія. Пры наяўнасці адпаведных падстаў, зразумела. Напрыклад, калі пратакол ва ўчастковай камісіі вывешаны з аднымі лічбамі, а ў акруговай ён ужо з іншымі. Ці нехта з членаў камісіі напісаў асаблівае меркаванне, не пагадзіўся з вынікамі выбараў. Быў і такі выпадак, калі назіральнік паведаміў, што бачыў, як укідвалі бюлетэнь. Пры падазрэнні аб памылцы ці фальсіфікацыі галасы абавязкова пералічваюцца.

Крымінал

СПОНСАРСТВА ПА-ЗА ЗАКОНАМ

Генеральная пракуратурай закончана расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да былога дырэктара РУП «Белрэсурс» В. Шаўлоўскага.

Як адзначаюць у Генпракуратуры, гэта крымінальная справа была выдзелена ў асобную в

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

11
ЛІПЕНЯ
2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 27 (15531)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ: ЧАС ПАДАВАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

У Беларусі вышэйшую адукацыю можна атрымаць у 43 ВНУ дзяржаўнай формы ўласнасці і 10 ВНУ прыватнай формы ўласнасці. У ВНУ даюць веды па больш чым 350 спецыяльнасцях і 1 тыс. спецыялізацый. Плануецца, што сёлета студэнтамі-першакурснікамі стануць 81,2 тыс. чалавек. Паступленне абітурыентаў праходзіць у некалькі этапаў: рэпетыцыйныя і цэнтралізаванае тэсціраванні, прафесійна-псіхалагічнае субяседаванне на некаторыя спецыяльнасці, падача дакументаў у выбраную навучальную ўстанову, калі ёсць неабходнасць — здача іспытаў у ВНУ і, нарэшце, уласнае прозвішча ў спісе тых, хто паступіў.

Уступная кампанія праходзіць спакойна і на вельмі высокім узроўні, лічыць **міністр адукацыі Аляксандр РАДЗЬКОЎ.** Зладжаная работа ўсіх спецыялістаў дазваляе своечасова рэагаваць на ўсе пытанні, што ўзнікаюць пры паступленні абітурыентаў у навучальныя ўстановы краіны.

Каментуючы змяненні, уведзеныя ва ўступнай кампаніі гэтага года, міністр, у прыватнасці, адзначыў зацвярджэнне 1 ліпеня пераводнай шкалы тэставых балаў па ўсіх прадметах цэнтралізаванага тэсціравання. Яна вызначыла ніжняе станоўчае значэнне тэставых балаў па кожным з прадметаў, вынесеных на ЦТ.

Як патлумачыў Аляксандр Радзькоў, усярэдненая шкала, уведзеная ў мінулым годзе, не дазваляла многім абітурыентам прадоўжыць удзел ва ўступнай кампаніі, таму было вырашана вярнуцца да прызнанай методыкі аналізу вынікаў ЦТ. Шкала пераводу ўстанаўліваецца пасля правядзення саміх іспытаў і ўлічвае колькасць абітурыентаў, колькасць адказаў з нізкімі баламі і іншыя спецыяльныя параметры.

Такім чынам, **сёлета сертыфікаты атрымалі абітурыенты, якія атрымалі на ЦТ балы не ніжэй за:** руская і беларуская мовы — 13 балаў, гісторыя Беларусі — 17, сусветная гісторыя найноўшага часу — 17, «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» — 16, геаграфія — 18, біялогія — 18, матэматыка — 8, фізіка — 8, замежныя мовы — 16 балаў.

У цэлым, на думку міністра адукацыі, тэхналогіі масавага кантролю ведаў у форме ЦТ вельмі прагрэсіўныя і прыняты як абітурыентамі, так і бацькамі. Практыка паказала, што ЦТ вельмі дакладна вызначае ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў, адзначыў Аляксандр Радзькоў. Прычым гэта відаць па наступнай вучобе студэнтаў. Нагадаў міністр і аб тым, што ўступная кампанія ў ВНУ Беларусі стала карацей на тыдзень. Цяпер яна завершыцца не 11 жніўня, як раней, а 4 жніўня.

З 5 ліпеня пачаўся прыём дакументаў ва ўстановы адукацыі культуры, міністэрстваў абароны, унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях. Тэрмін прыёму дакументаў на дзённую форму навучання ў Акадэмію МУС, Ваенную акадэмію, Камандна-інжынерны інстытут і Гомельскі інжынерны інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях на платную і бюджэтную формы навучання вызначаны з 5 па 13 ліпеня. Уступныя іспыты ў гэтых ВНУ пройдуць з 14 па 17 ліпеня.

Сёння — апошні дзень падачы дакументаў у «творчыя» ВНУ. У Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў паток абітурыентаў не спадае ўсе гэтыя дні. Будучыя акцёры, рэжысёры, мастакі, дызайнеры, скульптары, тэатразнаўцы, аператары старанна выводзяць пашпартныя даныя, вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. Некаторыя — дадаткова пішуць і яшчэ пра свае поспехі падчас вучобы ў школе. «А мы не ведаем індэкс нашага горада», — з разгубленасцю пытаюцца дзяўчаты ў прыёмнай камісіі і нервова пачынаюць тэлефанаваць мамам. «Ну нічога страшнага, гэта ж не рынцыпова!», — супакойваюць абітурыентаў. Групкі бацькоў стаяць пад стэндамі са звесткамі пра ўступную кампанію, абмяркоўваюць паміж сабой нешта і час ад часу зазіраюць у аўдыторыю з рэплікамі «Толькі памылку не зрабі!», «Ты — лепшая!»… Безумоўна, у паветры лунае хваляванне, а ў вачах чытаецца «Толькі б пашчасціла!». Але гэтае хваляванне — толькі пачатак, бо з 12 па 21 ліпеня хлопцам і дзяўчатам трэба будзе паказаць свае здольнасці ў акцёрскім майстэрстве, прывабіць цудоўнымі вакальнымі данымі, зрабіць непаўторны малюнак, навяяць скульптуру… Карацей, упэўніць у тым, што яны — творчыя людзі і павінны вучыцца толькі ў творчым ВНУ.

За ўступнай кампаніяй назірала Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, а таксама Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў прымае дакументы на ўсе формы навучання з 5 па 11 ліпеня. Экзамены абітурыенты будуць здаваць з 12 па 21 ліпеня.

Залічэнне абітурыентаў у ВНУ сілавых ведамстваў на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту завершыцца 18 ліпеня, на завочную і вячэрнюю формы — 20 ліпеня, на дзённае, завочнае і вячэрняе навучанне на ўмовах аплаты — 22 ліпеня.

У ВНУ культуры залічэнне будзе ажыццяўляцца на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту па 22 ліпеня, на завочнае і вячэрняе навучанне за кошт сродкаў бюджэту — па 24 ліпеня, на дзённую, завочную і вячэрнюю формы на ўмовах аплаты — па 26 ліпеня. Усе іншыя дзяржаўныя і прыватныя ВНУ (акрамя завочнай і вячэрняй формаў атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю) на ўсе формы атрымання адукацыі будуць прымаць дакументы ў другую чаргу — з 12 па 23 ліпеня. А ўступныя іспыты ў гэтых ВНУ (акрамя завочнай і вячэрняй формаў атрымання адукацыі ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю) пройдуць з 24 па 28 ліпеня.

Залічэнне ў гэтых ВНУ на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту пройдзе па 30 ліпеня, на завочную і вячэрнюю формы за кошт сродкаў бюджэту — па 1 жніўня, платнікі будуць залічаны ў тэрмін па 4 жніўня. На завочную і вячэрнюю формы навучання ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю на месцы, устаноўленыя кантрольнымі лічбамі прыёму, і на ўмовах аплаты абітурыенты будуць залічвацца па 25 снежня.

З 30 ліпеня (дзень залічэння на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту) пачнецца «перамяшчэнне» дакументаў: з 30 па 31 ліпеня прымаюцца дакументы на завочную і вячэрнюю формы навучання ад абітурыентаў, якія не прайшлі па конкурсе на дзённую форму за кошт сродкаў бюджэту ў гэтай жа ВНУ, а з 30 ліпеня па 2 жніўня прымаюцца дакументы на ўсе формы атрымання адукацыі (дзённую, завочную, вячэрнюю) ад абітурыентаў, якія падалі першапачаткова свае дакументы ў тэрмін з 12 па 23 ліпеня, на ўдзел у конкурсе як за кошт бюджэту, так і на ўмовах аплаты.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ІНТЭРНАТ ЦІ ЗДЫМНАЯ КВАТЭРА?

«Плюсы» і «мінусы» студэнцкага жылля

Вядомы паэт Эдуард Асадаў у адным са сваіх вершаў выказаў смелую думку пра тое, што студэнты — гэта асобая і самая дзіўная ў свеце нацыя. Не магу не пагадзіцца з такім сцвярджэннем, бо навідавоку ўсе прыкметы аўтаноміі: форма існавання — напаўсонная падчас лекцый, бадзёрая і мітуслівая на экзаменах, месца пражывання — традыцыйна: інтэрнат. Але, на жаль, апошні кампанент з'яўляецца часткай жыцця далёка не ўсіх прадстаўнікоў студэнцтва.

Праблема з жыллём у сталіцы для большасці студэнтаў-не мінчан сапраўды стаіць вельмі востра: мінскія ВНУ ў стане забяспечыць жыллём толькі 75 працэнтаў студэнтаў. Асабліва балюча гэта тэма з'яўляецца для навучэнцаў БДУ, БДПУ імя Максіма Танка: калі ты не маеш ільгот ці не з'яўляешся актывістам, а першакурснікі проста па вызначэнні быць імі не могуць, даводзіцца шукаць кватэру, у інтэрнат наведваючыся толькі па запрашэнні сяброў.

Мне часам прыгадваецца той дзень, калі яшчэ да канца не паверыўшы ў шчасце свайго новага студэнцкага жыцця, кінулася з усімі рэчамі ў гэты горад, як у прорву. Тады я яшчэ не ведала, што такіх вольных шукальнікаў кватэры нават не сотня. Напачатку ўсё мроілася вельмі простым, але пасля пятнаццатай тэлефоннай размовы з нязменным адказам «кватэра здадзена» рукі пачалі адчайна апускацца. Бліжэй да вечара, нарэшце, пашчасціла: пакой амаль што сам знайшоў мяне — свет, як кажуць, не без добрых людзей. Некаторым пашчасціла менш: адны жывуць у знаёмых, іншыя штодзённа катаюцца на электрычцы.

І вось, здаецца, знайшоў, дзе прытуліцца, і праблем больш няма. Але на практыцы, звычайна, такія прытулкі не вытрымліваюць нават самых мінімальных запытаў: дзе з гаспадарамі не пашанцуе, дзе кошт вырастае ў адваротнай прапарцыянальнасці са стыпендыяй і бацькоўскай кішэняй.

Не можа быць, каб усе кватэрныя гаспадары ставілі перад сабой адну-адзіную мэту — здзекавацца з бедных студэнтаў! — абурацеся вы. Зразумела, не. У здымнага жылля ёсць неаспрэчная колькасць плюсаў. Па-першае — большы метраж тваёй прыватнай прасторы. Да гэтага — утульная і заўсёды чыстая кухня, такі ж санвузел. І нарэшце, больш-менш спрыяльная для вучобы атмасфера. Пералічваць можна доўга. Чаму ж тады амаль кожны «кватарант» марыць пра жыццё-быццё ў інтэрнаце і штогод упарта збірае даведкі для засялення?

Вядома, не апошняе месца займае грашовае пытанне. За пяць гадоў розніца між аплатай за інтэрнат і кватэру набягае такая, што можна было б купіць уласнае аўто. Да таго ж адкрыю вам яшчэ адзін сакрэт: у інтэрнаце поруч са студэнтамі жывуць весялосць і сапраўднае сяброўства. Дзе яшчэ можна ў дзве гадзіны ночы пазычыць гарбаты ці даведацца, што заўтра раніцай не будзе фізкультуры?! Тут заўсёды можна знайсці ўсе патрэбныя падручнікі і канспекты — проста рай для сапраўднага студэнта.

Але ідэальнага не бывае, і ў інтэрнаце таксама дзейнічае прынцып: добра там, дзе нас няма. Многія не супраць пажыць асобна, каб новая рэч была «толькі мая», а не агульная, каб усе клаліся спаць і прачыналіся разам, каб не перашкаджала музыка з суседняга пакоя. Тут недахопаў можна выдумаць колькі заўгодна. Але хочацца думаць, што сяброўства, якое нараджаецца ў гэтых казённых сценах, мацнейшае за бытавыя дробязі.

Час ідзе, і ўсё змяняецца. Сёння ўжо не студэнты выбіраюць інтэрнат, а інтэрнат выбірае студэнтаў. Ды будзем спадзявацца, што хутка ўсіх нас аб'яднае новы дом з агульнай назвай Студэнцкая вёска, будаўніцтва якой плануецца пачаць ужо сёлета. Дарэчы, архітэктары ўжо цалкам падрыхтавалі эскіз студэнцкай вёскі, якую плануецца пабудаваць на праспекце Дзяржынскага. Гэта будзе комплекс з інтэрнатаў, магазінаў, фізкультурных цэнтраў, кафэ, футбольнага стадыёна і паркоўкі. Хочацца верыць, што хутка кожны першакурснік атрымае ключы ад таго пакоя, які на працягу пяці гадоў і будзе называцца яго домам.

Вольга ДАМАРАЦКАЯ.

ШТО НІ ДЗЕНЬ — ТО СВЯТА!

У кругазвароце шэрых будняў, калі з-за стомленасці нічога не радуе і ўсё здаецца такім звыклым і банальным, усе мы з нецярплівасцю чакаем таго, што б унесла хоць крышачку прыгажосці і вяселля ў наша жыццё, дапамагло забыцца на службовыя турботы, выехаць на адпачынак з сябрамі ці проста выключыць тэлефон і пабыць сам-насам дома. Чакаем святаў. Усім вядома, што да Новага года пачынаюць рыхтавацца ўжо з першых дзён снежня, што 8 Сакавіка ў горадзе амаль немагчыма набыць кветкі, а агонь у вачах і шчаслівыя ўсмешкі на тварах сведчаць пра тое, што сёння Дзень Усіх Закаханых.

Аднак наш каляндар змяшчае значна больш тых святаў, пра якія мы ведаем. Справа ў тым, што не кожнае з іх у нас адзначаецца. Можа, яны не такія маштабныя і няма ніякай неабходнасці рабіць іх дзяржаўнымі, але ўсё роўна такія дні дапамогуць узняць настрой, паслужыць падставай для нечаканага падарунка ці проста прыемнага слова.

Так, не кожны ведае, што 11 студзеня ва ўсім свеце адзначаецца самае «ветлівае» свята — Міжнародны дзень «Дзякуй». Слова «дзякуй» (руск. спасибо) — гэта ўстойлівае скарачэнне выразу «Спаси Бог». Гэтым выразам на Русі выказвалі падзяку. Мы таксама робім гэта кожны дзень, не заўсёды разумеючы сэнс ветлівых слоў. А між тым псіхолагі лічаць, што такія словы — гэта своеасаблівыя знакі ўвагі, якія здольныя сагрэць нашыя душы сваёй цеплынёй.

Мяркую, многія чулі пра Дзень здароўя. Але сумняваюся, што ім вядома зусім супрацьлеглае свята — Сусветны дзень хворага, — якое адзначаецца каталікамі ў дзень Лурдскай Божай Маці — 11 лютага. Штогадовае святкаванне Дня хворага мае сваю мэту: даць адчуць супрацоўнікам шматлікіх медыцынскіх арганізацый, вернікам, усяму грамадству неабходнасць забеспячэння лепшага догляду хворых, палегчыць іх пакуты.

Яшчэ адно незвычайнае свята адзначаецца 31 мая. Калі маеце сярод сваіх сябровак бландзінак, можаце смела віншаваць іх у гэты дзень з Сусветным днём бландзінак. Упершыню прайшло яно ў 2006 годзе. Тады ж адбылася цырымонія ўручэння Брыльянтавай Шпількі, на якой прысутнічала шмат светлавалосых акцёраў, вядучых, спевакоў. Дарэчы, як сцвярджае навука, праз 200 гадоў на Зямлі не застанецца ніводнага бландзіна. Так што трэба іх берагчы і ахоўваць, а не складаць анекдоты.

А вось адно з самых прыемных святаў насельніцтва Зямлі адзначыла зусім нядаўна — 6 ліпеня прайшоў Сусветны дзень пацалункаў. У гэты дзень усе ахвотнікі могуць раскрыць свае пачуцці і душы на поўных правах. Ва ўсім свеце 6 ліпеня праводзяцца конкурсы пацалункаў, пераможцы якіх атрымліваюць розныя прызы і падарункі. На мой погляд, зусім неблагая традыцыя. Было б нядрэнна ўвесці яе і ў нас. Цікава, хто б выступіў супраць?

А зараз самы час згадаць словы вядомага рускага класіка Фёдара Дастаеўскага: «Прыгажосць выратуе свет». Менавіта гэтай вялікай з'яве і прысвечаны Сусветны дзень прыгажосці. З 1985 года 9 верасня ў свеце асабліва вітаецца ўсё прыгожае, што прыносіць душэўны спакой і эстэтычную асалоду. Заканамернасцю ў гэты дзень стала правядзенне конкурсаў прыгажосці, для ўдзелу у якіх не абавязкова мець параметры 90-60-90. Галоўнае — гэта знешняя своеасаблівасць і ўнутраная гармонія.

Для заядлых камп'ютаршчыкаў і прыхільнікаў SMS таксама ёсць прыемная навіна! 19 верасня можаце збірацца і шумна святкаваць Дзень нараджэння «Смайла». У гэты дзень у 1982 годзе прафесар Універсітэта Карнегі-Мэлана Скот Фалман упершыню прапанаваў выкарыстоўваць 3 сімвалы, якія ідуць адзін за адным, — двукроп'е, працяжнік і дужку, каб пазначыць «усмешку» ў тэксце. За 25 гадоў «смайл» стаў неад'емным атрыбутам, які дапамагае перадаваць інтанацыю голасу і міміку, лепш разумець суразмоўцу, улаўліваць яго настрой і проста выклікае станоўчыя эмоцыі.

Ну а зараз, паважаныя мужчыны, я звяртаюся да вас. Атрымліваючы падарункі і розныя прыемныя словы толькі 23 лютага, вы маеце поўнае права для пратэсту. Адчуваць сябе царом вы можаце таксама ў першую суботу лістапада, калі адзначаецца Сусветны дзень мужчын. Прапанаваў гэта... Міхаіл Гарбачоў, а шэраг міжнародных арганізацый падтрымалі яго. Так што патрабуйце ад сваіх жанчын у гэты дзень пяшчоты і ласкі, галоўнае — ведаць меру, бо мы заўсёды зможам адпомсціць 8 Сакавіка.

...Пісаць бы і пісаць пра гэтыя святы. А калі б зрабіць кожнае з іх дзяржаўным, то і працаваць не было б калі. Аднак не трэба прытрымлівацца календара. Мы самі здольныя ператварыць кожны свой дзень у непаўторную і феерычную дзею. Трэба толькі навучыцца бачыць святочнае ў паўсядзённым, а звычайную ўсмешку прымаць за самы шыкоўны падарунак!

Ірыны БАГАМОЛАВА.

Дарэчы, сёння чалавецтва святкуе Сусветны дзень народанасельніцтва.

Хуткі дэмаграфічны рост стаў у 60-я гады нагодай для сур'ёзнага непакою. Па даных ААН, у 2050 годзе на Зямлі будзе пражываць каля 9,3 млрд людзей. А абсалютны прырост насельніцтва ў цяперашні час складае амаль 77 млн чалавек. Якія наступствы гэта можа мець? Менавіта з гэтым пытаннем я і звярнулася да жыхароў сталіцы.

Надзея, студэнтка:

— Па-першае, гэта прывядзе да значных экалагічных праблем: забруджванне паветра, разбурэнне азонавага слою, недахоп зямельных рэсурсаў, вады. Па-другое, сацыяльныя праблемы. Не кожны зможа атрымаць адукацыю, уладкавацца на працу. Адсюль беспрацоўе, беднасць. Усё гэта прывядзе да зніжэння агульнага ўзроўню жыцця.

Ніна, студэнтка:

— Я лічу, што дэградацыі грамадства нам не пазбегнуць. Хто цяпер становіцца бацькамі? Падлеткі, тыя, хто яшчэ сам зусім нядаўна быў дзіцем. Адкуль у іх вопыт выхавання? Таму і расце колькасць дзіцячых дамоў і інтэрнатаў, бо няма нармальных сем'яў.

Сяргей, вайсковец:

— Баюся, што Зямля проста не вытрымае, яна збяднее. Адкуль у яе такая колькасць прыродных багацця ў рэсурсаў, неабходных для жыццядзейнасці? Над гэтым трэба задумвацца ўжо сёння, бо з году ў год праблема будзе расці.

МАРЫ ПАВІННЫ ЗДЗЯЙСНЯЦЦА! І ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА...

Радасці выхаванцаў аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў, якое дзейнічае на базе Чэрвеньскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, няма межаў: цяпер яны могуць займацца спортам на сучасным велатрэнажоры і разагравацца абеды ў мікрахвалевай печы. З такімі падарункамі наведалі аддзяленне спартыўнае дабрачыннае таварыства «Мары збываюцца» (сярод гасцей артысты і спартсмены: Сяргей Мінскі, Улада, Вольга Барабаншчыкава, Анастасія Касянкова) разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў па Чэрвеньскай, Бярэзінскай і Пухавіцкай акругах Людмілай Ляшчанка.

Паводле слоў дырэктара Чэрвеньскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Людмілы Шаркоўай, да гэтага часу ў аддзяленні быў толькі электрачайнік.

— Абеды ж, якія дзеці прыносяць з сабой, педагогі, якія жывуць недалёка ад аддзялення, насілі разаграваць дадому. Цяпер такой неабходнасці не будзе. Весці актыўнае жыццё нашым выхаванцам вельмі складана, некаторым захворванне не дазваляе не тое што бегаць і скакаць, але і мячык злавіць. Таму, зразумела, займацца на велатрэнажоры змогуць не ўсе. Але нашы дзеці шчырыя: яны радуюцца за сваіх сяброў, якія могуць круціць педалі.

— Не абмінаем увагай і інвалідаў-калясачнікаў, якія не маюць магчымасці праводзіць час у нашым аддзяленні, — дадае Людміла Генадзьеўна. — Нашы псіхолагі наведваюць іх дома.

Надзея ДРЫЛА.

ВІЦЕБСК — СТАЛІЦА МАЛАДЗЁЖНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

12 ліпеня Віцебск на адзін дзень стане цэнтрам маладзёжнай актыўнасці і ініцыятывы. Па традыцыі ў рамках Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пройдзе Дзень моладзі.

Як і заўсёды, ён будзе багатым на шматлікія акцыі і мерапрыемствы. У прыватнасці, пройдуць кірмаш праектаў «Вясёлка маладзёжных ініцыятыў», прэзентацыя маладзёжных і дзіцячых СМІ, творчы конкурс «Бітва дыджэяў» і шмат іншага. Як адзначыў **сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Далжэўскі**, да маладзёжнага свята юнакі і дзяўчаты рыхтуюцца загадзя, каб прывезці ў горад на Дзвіне свае новыя ініцыятывы і задумы.

— На кірмашы праектаў «Вясёлка маладзёжных ініцыятыў» будзе зроблены акцэнт на асноўныя і актуальныя сферы дзейнасці моладзі: спорт, тэатральнае і выяўленчае мастацтва, дызайн, мадэляванне, журналістыку, патрыятычнае выхаванне, — расказвае А. Далжэўскі. — Сем рэгіёнаў краіны прадстаўляюць сем накірункаў маладзёжных ініцыятыў. Для кожнай абласной арганізацыі ў адпаведнасці з жарабʼёўкай вызначана ініцыятыва, гэта значыць, тэматычная пляцоўка і колер афармлення. Усе дзеянні адбываюцца на цэнтральнай плошчы Віцебска, дзе і афармляюцца каляровыя пляцоўкі. Так і атрымліваецца вясёлка.

Паводле слоў Аляксандра Далжэўскага, сёлета своеасаблівым сімвалам Дня моладзі стане правядзенне шматлікіх спартыўных конкурсаў і спаборніцтваў. Удзельнікі змогуць паскакаць са скакалкай, пагуляць у настольныя віды спорту: шашкі, шахматы, даміно; атрымаць майстар-клас па фітнэсе, паўдзельнічаць у спаборніцтвах па дартсе, у акцыі па барацьбе з курэннем і выканаць песню на спартыўную тэматыку. На пляцоўцы маладых мастакоў «Стракатая палітра» пройдуць дэманстрацыі калекцый адзення маладых дызайнераў, конкурсы графіці і дзіцячага малюнка на асфальце. На патрыятычнай пляцоўцы — прэзентацыі рэспубліканскіх акцый маладзёжнага саюза, работ гісторыка-патрыятычных клубаў, конкурс франтавой песні, майстар-клас і конкурс па... намотванні ануч (у арміі юнакам спатрэбіцца). Заслугоўвае ўвагі і этнаграфічная пляцоўка. Тут пройдуць конкурс на лепшую вышыўку сімвала «Славянскага базару ў Віцебску», прэзентацыі экалагічных акцый БРСМ, майстар-класы па саломапляценні, ганчарстве, разьбе па дрэве. А на музычнай пляцоўцы можна паспяваць і патанцаваць.

— Прэзентацыя кожнай тэматычнай пляцоўкі будзе доўжыцца да паўгадзіны, — адзначае Аляксандр Далжэўскі. — Затым журы падвядзе вынікі і вызначыць трох пераможцаў, якія атрымаюць каштоўныя прызы і дыпломы. Галоўны крытэрый ацэнкі ўдзельнікаў — фантазія і творчасць, відовішчнасць і інтэрактыўнасць прэзентацыі.

Дарэчы, удзельнікам Дня моладзі зможа стаць кожны ахвотнік. Гледачы, якія возьмуць удзел у прэзентацыі тэматычных пляцовак, атрымаюць каляровыя стужачкі, якія затым яны прымацуюць да галінак дрэва, што сімвалізуе дружбу ўдзельнікаў «Славянскага базару ў Віцебску». Так, зноў у горадзе на Дзвіне заквітнее Дрэва дружбы. Акрамя таго, кожны можа стаць удзельнікам маладзёжнай латарэі. Умовы простыя: удзельнікі фестывалю атрымліваюць ад прамоўтараў у адзенні чырвона-зялёных тонаў буклет з латарэйным білетам. А ў Дзень моладзі кожны перадае свой латарэйны білет для ўдзелу ў розыгрышы. Пераможца атрымлівае прыз. Дарэчы, для ўдзелу ў розыгрышы білеты будуць прымацца на працягу ўсяго дня. А білеты, якія не выйгралі, разыгрываюцца ў наступным туры. Такім чынам, розыгрыш маладзёжнай латарэі і выдача выйгрышаў будуць праводзіцца кожную гадзіну.

І абавязкова трэба прыгадаць яшчэ адзін творчы конкурс маладзёжнага дня, які заўсёды выклікае павышаную цікавасць у гледачоў, — гэта «Бітва дыджэяў». У ёй па традыцыі возьмуць удзел дыджэі fm-радыёстанцый, лаўрэаты прэміі БРСМ, маладыя выканаўцы, танцавальныя калектывы. Такім чынам, прыязджайце заўтра ў Віцебск. Не пашкадуеце!

Святлана СУХАРКО.

Табе, абітурыент

— Высшее, второе высшее образование 3-ий поток

Программы заочного обучения предоставляют возможность получить **высшее юридическое и экономическое образование и престижный государственный диплом**. Прием на заочное отделение ежегодно с формированием 4-х потоков.

Консультации о порядке поступления и **заочного обучения** в специализированных ВУЗах с **государственной аккредитацией** по специальностям:

— ЮРИСПРУДЕНЦИЯ;
— ФИНАНСЫ И КРЕДИТ.

УСЛОВИЯ ЗАОЧНОГО ОБУЧЕНИЯ:

- Сессии в специализированных учебных центрах ВУЗов.
- Обеспечение всех студентов общежитием.
- Сроки обучения в соответствии с учебными планами и госстандартами:
  - **3—3,5 года** на базе **среднего специального профильного (техникум) и высшего** образования;
  - **6 лет** на базе среднего образования.
- Доступная стоимость обучения.
- Возможность продолжения обучения в аспирантуре ВУЗов.
- Выпускникам ВУЗов вручаются **ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ДИПЛОМЫ**, которые имеют полную юридическую силу в РБ и признаются в других европейских государствах.
- **Прием документов** в ВУЗах на заочное отделение (3-ий поток) **до 10 августа и 10 сентября.**

За более подробной информацией обращайтесь в «МНЮИ КОНСУЛЬТАНТ»

220004, г. Минск, ул. Коллекторная, д. 20 «А»,
тел.: (017) 200 82 57, 200 63 51
GSM (029) 509 82 57, (044) 709 82 57
www.mnji.by

Свидетельство о государственной регистрации № 190593633 от 13.01.2005 г. Мингорисполкома. УНП 190593633

У вёскі едзе... моладзь

Паводле звестак Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, за студзень—чэрвень сёлета на пастаяннае месца жыхарства і работы з дзяржаўнай падтрымкай у сельскую мясцовасць перасялілася 218 сем'яў беспрацоўных, сярэдні ўзрост якіх складае ад 29 да 35 гадоў. Дарэчы, у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года паказчык перасяленняў павялічыўся амаль у паўтара раза.

Апроч таго, як паведаміла прэс-сакратар міністэрства Галіна Трафіменка, за першае паўгоддзе сёлета 7,3 тыс. беспрацоўных былі накіраваныя на прафесійнае навучанне ці перанавучанне, а больш за 70 тысяч — уладкаваныя на пастаянныя месцы. Усё гэта дазволіла ўтрымаць сітуацыю на рынку працы стабільнай. У пачатку ліпеня ў цэлым па краіне ўзровень зарэгістраванага беспрацоўя склаў 1 працэнт ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Прычым найменшым (0,3 працэнта) паказчык беспрацоўя па ранейшаму захоўваўся ў сталіцы, а найбольшым (па 1,3 працэнта) ён быў у Віцебскай і Брэсцкай абласцях.

Сяргей ГРЫБ.

ЧАС ПАДАВАЦЬ ДАКУМЕНТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Трэба памятаць, што сёлета спецыяльную рэкамендацыю пасля праходжання прафесійна-псіхалагічнага субяседавання неабходна мець пры паступленні на спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «правазнаўства», «эканамічнае права», «журналістыка», «міжнародная журналістыка», «мытная справа». Гэту рэкамендацыю павінны мець усе, хто выбраў дзённую, вячэрнюю і завочную формы атрымання адукацыі (у тым ліку дыстанцыйную), навучанне ў скарочаныя тэрміны, а таксама тыя, хто будзе вучыцца на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Праходжанне субяседавання было абавязковым таксама для атрымання другой і наступнай вышэйшай адукацыі як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на ўмовах аплаты фізічнымі або юрыдычнымі асобамі. Без яе падаваць дакументы на паступленне на вышэй пералічаныя спецыяльнасці бессэнсоўна. Тыя, хто не паспеў або не захацеў прайсці субяседаванне, могуць удзельнічаць у конкурсе на атрыманне вышэйшай адукацыі па іншай спецыяльнасці або паступаць на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі (спецыяльнасць «правазнаўства») або чакаць прыёмнай кампаніі 2009 года.

У той жа час адменены экзамен унутры ВНУ па прадметах, уключаных у цэнтралізаванае тэсціраванне. Экзамены ўнутры ВНУ чакаюць абітурыентаў толькі па творчых дысцыплінах (малюнак, музыка, танец і інш.), літаратуры і фізічнай культуры. Акрамя таго, у іншай форме могуць праводзіцца ўступныя іспыты для дзяцей-інвалідаў, а таксама выпускнікоў ССНУ, якія паступаюць на скарочаныя тэрміны навучання.

Таксама ўнесены змяненні і дапаўненні, якія датычацца мэтавага набору на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю. Сярэдні бал школьнага атэстата ў такіх абітурыентаў павінен быць не ніжэй за пяць (раней — не ніжэй за шэсць). Абітурыент, які выказаў жаданне вучыцца ў ВНУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі па спецыяльнасцях сельгаспрофілю, павінен пражываць у сельскай мясцовасці не менш чым два гады на момант атрымання дакумента аб сярэдняй адукацыі. Пры гэтым навучальная ўстанова, якую скончыў выпускнік, які паступае на сельскагаспадарчую спецыяльнасць, можа быць размешчана і ў бліжэйшым горадзе.

Пры паступленні абавязкова будзе ўлічвацца сярэдні бал дакумента аб адукацыі. Так што залічэнне абітурыентаў у ВНУ або ССНУ на навучанне за кошт сродкаў бюджэту і на ўмовах аплаты на месцы па ўсіх формах атрымання адукацыі праводзіцца на конкурсе на падставе агульнай сумы балаў, падлічанай па выніках здачы ўступных іспытаў і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі, які вызначаецца па дзесяцібальнай шкале (з дакладнасцю да дзесятых доляў адзінкі).

Права на пазаконкурснае залічэнне захавана за дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама за пераможцамі і прызёрамі міжнародных і рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, спартыўных спаборніцтваў і за некаторымі іншымі катэгорыямі. Астатнія абітурыенты, якім раней прадастаўлялася такая льгота, будуць карыстацца правам пераважнага залічэння пры роўнай колькасці балаў, набраных на ўступных іспытах. Дзецям-інвалідам, інвалідам I і II груп прадастаўлена права ўдзельнічаць у конкурсе на завочную або вячэрнюю форму атрымання вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту.

З улікам змяненняў на рынку працы крыху павялічаны кантрольныя лічбы прыёму ў ВНУ Беларусі. Асноўныя змяненні закранулі структуры сеткі спецыяльнасцяў і колькасці месцаў для набору будучых маладых спецыялістаў. Так, калі ў 2007 годзе ў ВНУ на дзённую форму навучання на бюджэт былі прыняты 23 тыс. 67 чалавек, то сёлета плануецца прыняць 23 тыс. 344. Значна павялічана колькасць месцаў на спецыяльнасці медыцынскага профілю. Акрамя таго, зменена лічба прыёму на спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю — плюс 157 чалавек, у тым ліку на спецыяльнасць «транспарт» — на 16 чалавек больш, «вылічальная тэхніка» — на 45 (для патрэб Парка высокіх тэхналогій), на спецыяльнасці энергетычнага профілю — плюс 37 чалавек (у тым ліку для атамнай энергетыкі), «архітэктура і будаўніцтва» — на 102 чалавекі (з улікам дзённага і завочнага навучанняў). Некалькі павялічаны набор на спецыяльнасці «прамысловая хімія», «турызм і гасціннасць» і прыродазнаўчыя навукі. Як і летась, ВНУ будуць менш рыхтаваць педагогаў, юрыстаў і эканамістаў.

Тэрміны работы па размеркаванні складаюць адзін год — пасля атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі і два гады — пасля атрымання сярэдняй спецыяльнай або вышэйшай адукацыі. Усяго ў Беларусі рыхтуюць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па 341 спецыяльнасці. У цяперашні час навучанне аднаго студэнта-бюджэтніка абыходзіцца дзяржаве, без уліку выплаты яму стыпендыі, $2 тыс. 113 у эквіваленце, тады як студэнт, які вучыцца за плату, аплачвае толькі 51 працэнт ад гэтай сумы.

У любым выпадку, калі той, хто паступае, хоча аплаціць сваё навучанне, то дагавор аб падрыхтоўцы спецыяліста заключаецца толькі пасля прыняцця рашэння прыёмнай камісіі ВНУ аб залічэнні. Пастановай Савета Міністраў Беларусі ў 2008 годзе зацверджаны «Прыкладныя формы дагавораў аб падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на ўмовах аплаты» і інструкцыя Міністэрства адукацыі аб парадку заключэння дагавораў аб падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на ўмовах аплаты. Гэты дакумент з'яўляецца падставай для выдання загада аб залічэнні. Аплата за навучанне робіцца пасля залічэння абітурыента ў лік студэнтаў 1-га курса. Тэрмін аплаты за навучанне складае 15 і больш каляндарных дзён з дня заключэння дагавора.

Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.

777

ПАНЯДЗЕЛАК ПАЧЫНАЕЦЦА Ў СУБОТУ

Не сакрэт, што пачатак працоўнага тыдня звычайна эйфарыі не выклікае. Безумоўна, ёсць сярод нас тыя, хто і ў панядзелак «на працу — як на свята, а з працы — як з гасцей». Але гэта — адзінкі, апантаныя сваёй справай. У астатніх перспектыва выходзіць на працу — асабліва пасля выхадных — энтузіязму не выклікае. Больш за тое, усведамленне непазбежнасці гэтага факта псуе настрой на ўвесь уік-энд і самым дрэнным чынам адбіваецца на здароўі.

Галаўны боль, бяссонніца, расстройства страваванння, паніжэнне працаздольнасці, нейрадэрміт — гэта далёка не поўны пералік непрыемнасцяў, якія, паводле слоў саміх пацярпелых, абумоўлены іх работай. А дакладней, нежаданнем арганізма там з'яўляцца. Прычым гаворка ідзе не аб сімуляцыях (памятаеце, каб не ісці ў школу, можна было нагрэць тэрмометр над лямпачкай ці нацерці нос клеем?), а аб сапраўдных праблемах са здароўем у дарослых людзей, абумоўленых стрэсам ад усведамлення неабходнасці ісці ў панядзелак на працу.

У псіхалогіі ёсць нават спецыяльны тэрмін — **«сіндром панядзелка»**. Спецыялісты лічаць, што ён можа сфарміравацца яшчэ ў школьныя гады (трэба меркаваць, у тых, у каго не праходзілі фокусы з клеем і тэрмометрам).

Часцей за ўсё найбольш востра перажываюць заканчэнне выхадных тыя, хто не задаволены сваёй працай і занадта напружаным графікам. Такія пакутнікі пачынаюць адчуваць трывогу і непакой яшчэ днём у нядзелю (а асабліва ўразлівыя грамадзяне псуюць сабе нервы яшчэ з суботы), яны не могуць расслабіцца і атрымаць асалоду ад выхаднога дня. Лепшае выйсце ў такім выпадку — змяніць месца працы. Аднак пачуццё трывогі напрыканцы ўік-энду могуць адчуваць і тыя, хто любіць сваю работу. На думку псіхолагаў, гэта можа быць абумоўлена рознымі прычынамі, у прыватнасці тым, што людзі прывыклі жыць «з апярэджэннем». Лепшая парада — навучыцца цаніць кожны момант, кожнае імгненне, радавацца таму, што ёсць тут і зараз, аднак, пагадзіцеся, прасцей параіць, чым прытрымлівацца парады на практыцы.

Для аслаблення «стрэсу-ад-прадчування-панядзелка» варта стварыць сабе пэўны вячэрні рытуал: загадзя абзавесціся цікавай кніжкай ці фільмам, прадумаць асобае меню лёгкай вячэры, стварыць камфортную абстаноўку ў кватэры.

Некаторыя, каб адцягнуць непазбежнае, у нядзелю вельмі позна кладуцца спаць. Для такіх людзей часткай вячэрняга рытуалу можа стаць пэўная тэлевізійная праграма, тэле-шоў. Яна будзе выконваць тую ж ролю, што для дзяцей «Добрай ночы, малыя»— «сімвалізаваць» завяршэнне дня. Яшчэ адной з прычын трывожнага стану можа быць рэзкая змена рытму — жорсткага раскладу будняў і расслабленасці выхадных. У такім выпадку зняць напружанне дапаможа падрыхтоўка да новага працоўнага тыдня: складанне спіса спраў на панядзелак, праверка электроннай пошты.

Як выявіць сіндром панядзелка?

Агульная млявасць, абыякавасць, расслабленасць, санлівасць... — і ўсё гэта ў панядзелак ранкам? На працоўным месцы? Значыць, вы — ахвяра **СП**. Спецыялісты завяраюць, што ад яго можна пазбавіцца. Вось толькі спачатку трэба прааналізаваць сябе — толькі ў першы працоўны дзень тыдня вы адчуваеце нянавісць да сваёй работы, ці гэта звыклы для вас стан. У апошнім выпадку можна смела казаць пра **ПСП** — пастаянны сіндром панядзелка. Вас проста не задавальняе ваша сённяшняе месца працы — шукайце новае.

Знаўцы раяць пачынаць барацьбу з СП яшчэ з пятніцы. Звычайна перад выхаднымі мы любім расслабляцца і адкладваць работу на панядзелак, калі на нас і без гэтага звальваецца гара неадкладных спраў. Менавіта ў пятніцу трэба напружыцца і як след папрацаваць, «падагнаць» усе «хвасты». Тады панядзелак будзе менш стрэсавым, а гэта вельмі важна для арганізма, які і без таго будзе адчуваць пакуты перабудовы з адпачынку на рабочы рэжым.

Толькі тое, хто ўмее добра адпачываць, умее і добра працаваць. Вазьміце гэтую аксіёму на ўзбраенне. Прычым тут маюцца на ўвазе не застоллі-гулянкі, а змена дзейнасці. Калі вы — ударнік інтэлектуальнай працы і па роду дзейнасці большую частку працоўнага часу праводзіце за камп'ютарам — значыць, вам варта на выхадных заняцца спортам, паплаваць у басейне, схадзіць у паход, прагуляцца. Калі з панядзелка па пятніцу вы напружваецеся фізічна, — у суботу-нядзелю паваляйцеся ў ложку з добрай кніжкай, схадзіце ў кіно ці тэатр. І ў любым выпадку — не думайце аб працы! Сяброўскія застоллі і ўрачыстыя банкеты лепш перажыць у пятніцу і суботу (пажадана без алкагольных злоўжыванняў і пераядванняў), а ў нядзелю раней легчы спаць, каб потым не «кляваць носам» на працы.

Многім дапамагае справіцца з СП матывацыя — уяўленне задавальнення ад атрымання ў канцы месяца заробку, траты грошай на што-небудзь вельмі прыемнае і доўгачаканае. Паспрабуйце пераканаць сябе, што на сваёй рабоце вы самараэлізуецеся, знаёміцеся з цікавымі людзьмі, кантактуеце з калегамі.

Пачынаць працоўны панядзелак лепш з дробязяў: разгрэбці пошту, навесці парадак на стале, а потым паступова пераходзіць да больш складаных рэчаў. Не забывайцеся падчас работы рэгулярна рабіць невялікія перапынкі — хвілін на 10 — усё ж такі вы не аўтамат. Можна заняцца вытворчай гімнастыкай, папіць чаю з калегамі (пры жаданні ва ўсім можна знайсці пазітыў!)

— У многіх індаеўрапейскіх народаў да прыняцця хрысціянства 7-дзённы тыдзень пачынаўся з нядзелі — выхаднога дня, — тлумачыць **астролаг Уладзімір ВАСЮК**. — Людзі тых часоў ведалі, што за кожны дзень тыдня «адказвае» адна з сямі бачных планет Сонечнай сістэмы. Ад яе і залежыць пералік канкрэтных спраў, заняткаў і абавязкаў, якім, з пункту гледжання астралогіі, варта прысвяціць канкрэтны дзень.

Нядзеля «падпарадкоўвалася» Сонцу, а значыць, гэты дзень чалавек павінен быў прысвяціць самому сабе: адпачыць, расслабіцца. Панядзелак быў звязаны з Месяцам, а ён «адказвае» за дом, сям'ю. У панядзелак нашы продкі займаліся сямейнымі і хатнімі справамі, асабліва не напружваліся, пачыналі з невялікага і простага, прыводзілі сябе і жытло ў парадак. Аўторак, над якім панаваў Марс, добра падыходзіў для «мужчынскіх» заняткаў — вырабу зброі, загартоўкі сталі, усемагчымай пачынцы з дапамогай інструментаў, складанню комінаў, вязанню войнаў. Серада «належала» Меркурыю. У гэты дзень удалымі былі інтэлектуальныя заняткі, вучоба, сустрэчы, знаёмствы, абмен думкамі і г.д. Чацвер — дзень Юпітэра, найбольш спрыяльны для ўзаемадзеяння з уладамі, афармлення афіцыйных дакументаў. Пятніца належала Венеры. У гэты дзень добра браць і аддаваць пазыкі, рабіць пакупкі (грошы — на зямным узроўні — гэта таксама аспект кахання). Сатурн, які адказваў за суботу, бласлаўляў на завяршэнне ўсіх распачатых раней спраў, на падвядзенне вынікаў.

Такая сістэма была больш гарманічнай, чым сённяшняя. Прынамсі, у старажытнасці існаваў не толькі 7-дзённы, але і 14-дзённы тыдзень. 7-дзённы называюць ніжэйшым тыднем і выкарыстоўваўся радавымі грамадзянамі. 14-дзённы (вышэйшы тыдзень) — прымяняўся ў асноўным жрацамі для складаных астранамічных разлікаў.

Цяпер працоўны тыдзень змясціўся на адзін дзень. Пасля адпачынку народу адразу даводзіцца «ўпрагацца» ў складаныя справы, вось з гадамі і назапасіўся сіндром панядзелка. Першае, што тут трэба ўлічваць, гэта псіхалагічны фактар, — мы імкнёмся ўсё важнае паспець пачаць у панядзелак. Акрамя таго, сучасныя людзі страцілі прынцыпы гарманічнага размеркавання работ і абавязкаў, якімі валодалі нашы продкі, і цяпер неапраўдана перагружаюць сябе на пачатку тыдня, каб паспець «падрыхтавацца да выхадных» ў чацвер-пятніцу.

Нам трэба навучыцца разумна размяркоўваць энергію і выпрацоўваць стратэгію і тактыку прыкладання намаганняў, тады сіндром панядзелка знікне сам сабой.

Інга МІНДАЛЁВА.

«Цяжкія» дзеці

ПРАСТУПАК — ЯШЧЭ НЕ ПРЫСУД

Злоўжыванне моцнымі напоямі, ад'езды на работу ў суседнюю Расію, просты недахоп увагі з боку бацькоў — прычын тут можна назваць шмат. Вынік жа ўсяму гэтаму адзін. На ўліку ў інспекцыі па справах няпоўнагадовых далёка не самага вялікага па колькасці насельніцтва Чавускага раёна знаходзяцца больш за тры дзесяткі школьнікаў. Даводзіцца канстатаваць, што «цяжкія» дзеці становяцца больш «маладымі»: калі раней галоўныя праблемы былі з «прыходным узростам», то цяпер правапарушальнікі ў 5—6 класах — факт ужо нярэдкі. Прычым асаблівай увагі ўсе яны патрабуюць менавіта летам, калі не трэба хадзіць у школу і з'яўляецца шмат вольнага і «бескарыснага» часу.

Амаль паўтара дзесятка кіламетраў на ўсход ад райцэнтра. Урочышча Слоўтава было вядома прыгожым лесам і маляўнічымі краявідамі заўсёды, нездарма гэтыя мясціны здаўна прывабліваюць аматараў ціхага адпачынку. Зрэшты, цяпер Слоўтава мае яшчэ адну асаблівасць — сёння тут знаходзіцца турысцкі кругласутачны палаткавы лагер. Поўны кошт пуцёўкі сюды складае 115 тыс. рублёў, памер непасрэдна бацькоўскай аплаты вагаецца ў межах 11—15 тыс., працягласць змены вызначана ўсяго ў 9 дзён. Словам, нічога дзіўнага тут нібыта няма. Калі б не адна акалічнасць: сярод 20 жыхароў летніка ва ўзросце ад 10 да 17 гадоў ёсць як звычайныя вучні, так і школьнікі, што ўжо маюць праблемы з законам.

— Увогуле вырашана, што на працягу лета лагер павінны наведаць усе «праблемныя» дзеці раёна, хоць ніякага прымусу тут няма і быць не павінна, — кажа метадыст аддзела адукацыі Наталля Кандраценка. — Сапраўды, спачатку многія едуць без вялікай ахвоты, але закончыцца змена — пачынаюць прасіцца назад. Бо трэба разумець асаблівасць гэтых школьнікаў: іх можа не прывабліваць фізіка ці матэматыка, аднак фізкультура і спорт былі і застаюцца па-за канкурэнцыяй.

Увесь дзень тут распісаны літаральна па хвілінах. Традыцыйныя зарадка, уборка тэрыторыі, спартыўныя мерапрыемствы, віктарыны, сняданак-абед-вячэра, збор каля вячэрняга вогнішча. Абавязковым пунктам праграмы кожнай змены становіцца экскурсійная паездка ў дэндрарый Горацкай сельгасакадэміі, у мемарыяльны комплекс і заасад у Буйнічы пад Магілёвам, на Блакітную крыніцу ў Слаўгарадскім раёне або Чавускі краязнаўчы музей. Аднак ці не галоўнай «разынкай» сталі штодзённыя паходы. Невялікія, на 5—7 кіламетраў — скажам, на месцы жорсткіх баёў мінулай вайны ў суседніх вёсках Бынава або Прылёпаўка. Прычым там жа адбываюцца сустрэчы са сведкамі тых падзей, а пры неабходнасці — ветэранам аказваецца дапамога.

— Вядома, можна было размясціць турыстычны лагер на тэрыторыі адной з вясковых школ, але ўсім зразумела, што гэта — для дзяцей нецікава, — заўважае Наталля Кандраценка. — Бо іншая справа — жыць у палатках на 4—6 чалавек, збірацца ўсім разам у намёце ў спёку ці ў дождж. Апроч таго, не трэба забываць, што «палаткавы варыянт» заўсёды выхоўвае адказнасць. Старэйшыя дапамагаюць даглядаць маладшых, кожны выконвае пэўную фізічную работу для ўсіх — ходзіць па ваду, нарыхтоўвае дровы, прыбірае наваколле, мые посуд.

Магчыма, адсюль і вынік. Перад кожнай зменай выхавальнікі атрымліваюць своеасаблівае «дасье» — адзін са школьнікаў зусім не супраць пакурыць, другі можа выпіць, трэці быў заўважаны ў крадзяжах... Аднак у лагеры нічога падобнага няма. Тут усе жывуць разам і ўсе — адносінамі.

Адначасова са школьнікамі ў лагеры заўсёды знаходзіцца дзяжурны міліцыянер. Разам з тым гэта не вымушаная неабходнасць. Прысутнасць прадстаўніка праваахоўных органаў тлумачыцца выключна правіламі бяспекі, бо сам летнік месціцца ў лесе далёка ад горада і іншых буйных населеных пунктаў. Прычым тут сам работнік міліцыі ператвараецца ў... выхавальніка. Ён заўсёды возьме ўдзел у спартыўным мерапрыемстве, пасядзіць з усімі ля вогнішча, пагутарыць у свабоднай абстаноўцы. І такая размова дзейнічае лепш за любыя «лекцыі».

Агульнай папулярнасцю карыстаюцца таксама віктарыны на прававыя тэмы, што праводзіць тут інспекцыя па справах няпоўнагадовых. А тым больш выклікае інтарэс кожнага візіт у лагер пажарных — на спецыяльнай машыне, у поўнай экіпіроўцы, з разгортваннем усёй тэхнікі і тушэннем імправізаванага ўзгарання. І зноў-такі з тлумачэннем асноўных правілаў проціпажарнай бяспекі.

— Трэба паўтарыцца, што ў турыстычным лагеры жывуць як «цяжкія» школьнікі, так і звычайныя дзеці, і ў бацькоў апошніх адразу ж узнікае шмат пытанняў, — адзначае Наталля Кандраценка. — Аднак сумненні знікаюць хутка. Кожнаму становіцца зразумела, што ўлік у інспекцыі па справах няпоўнагадовых — не прысуд, а прафілактычная мера. Да таго ж большасць «праблемных» вучняў здзейснілі праступак толькі адзін раз, і ставіць на іх крыж яшчэ вельмі рана.

Сяргей ГРЫБ.

Чавускі раён.

У БАРАЦЬБЕ СА СНІДАМ НЯМА ПЕРАПЫНКАЎ

У Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя, прысвечаная прафілактыцы інфекцыі СНІДу сярод моладзі. Статыстыка сведчыць, што пачынаючы з 1987-га па май 2008 года ў краіне зарэгістравана 9086 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі, а паказчык распаўсюджвання хваробы склаў 93,8 на 100 000 чалавек. З іх каля 35,4 працэнтаў складаюць жанчыны (3212 чалавек). Трывожыць той факт, што павялічваецца колькасць немаўлят, народжаных СНІД-інфіцыраванымі жанчынамі: 8 такіх дзяцей ужо памерлі.

Леанід ТУГАРЫН.

Мы — маладыя

Вывучэнне гісторыі немагчыма без вывучэння асноў хрысціянства

Нашчадак з роду Іасафата Кунцэвіча за ўвядзенне ў школе курса па гісторыі рэлігіі

Дзяніс Кунцэвіч, вучань цяпер 10 «А» класа педагагічнай гімназіі № 3 горада Мінска, удзельнічаў сёлета ў гарадской навуковай канферэнцыі ўпершыню. Секцыю гісторыі Беларусі ён абраў не выпадкова: гісторыя не проста любімы яго прадмет, але і, дзякуючы настаўніку Юліі Леанідаўне Стырне, — даўно ўжо стала захапленнем. А вось тэму Дзяніс узяў інтуітыўна: «Хрысціянізацыя Беларусі: вызначэнне гістарычнага развіцця. Сучасная канфесійная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь». Нягледзячы на тое, што ў школьных падручніках на гэту тэму мізэрна мала інфармацыі, Дзяніс не сумняваўся, што яго чакаюць цікавыя адкрыцці, і не памыліўся.

— У XXI стагоддзе чалавецтва ўступіла не з ваяўнічым атэізмам, а з верай у Бога, — тлумачыць Дзяніс свой выбар. — Пра гэта можна меркаваць дзякуючы сродкам масавай інфармацыі і тым зменам, якія адбыліся ў Беларусі пасля 1991 года. Адрэстаўраваны многія храмы, узводзяцца новыя цэрквы, касцёлы, мячэці. Мы, маладыя, далучаемся да гісторыі хрышчэння на землях Беларусі ў X стагоддзі і распаўсюджвання хрысціянства... Падчас працы над навуковай работай Дзяніс усведаміў тое, што для многіх даследчыкаў і гісторыкаў з'яўляецца азбучнай ісцінай: гісторыя Беларусі на працягу апошняга тысячагоддзя па сутнасці з'яўляецца хрысціянскай гісторыяй. Многія вядомыя са школьных падручнікаў падзеі прадсталі для юнага навукоўца ў новым святле, аказаліся напоўненыя іншым зместам, калі ён даведаўся, якую ролю ў гэтых падзеях адыгрывала вера людзей.

— Улады неаднаразова спрабавалі выкарыстаць рэлігію ў палітычных мэтах, — кажа Дзяніс. — Напрыклад, імкненне Вітаўта заключыць унію было прадыктавана варожымі адносінамі з Масквой. Як толькі гэтыя адносіны наладжваюцца, спробы ўніі пакідаюцца. Але пазней Ватыкан спрабуе кожны раз выкарыстаць зручны палітычны момант, каб далучыць да сябе літоўскія (альбо беларускія) епархіі. Вывучаючы гісторыю хрысціянства на нашых землях, я з цікаўнасцю адкрываў для сябе зусім іншую гісторыю сваёй краіны. Узяць тую ж унію, якую яшчэ называюць «грэка-лацінскай», «грэка-каталіцкай», «праваслаўна-каталіцкай» альбо «беларускай» верай. Яна была афіцыйна аб'яўлена ў Брэсце ў 1596—1598 гадах. Але мала хто ведае, што перад тым было як мінімум чатыры беспаспяховыя спробы яе заключэння. Нягледзячы на моцны ціск папскай і каралеўскай уладаў, многія выступалі супраць уніі. Чым больш жорстка дзейнічаў кароль польскі ў XV стагоддзі, тым больш узрастала колькасць праваслаўных і іх рэўнасць аб сваёй веры. Шостага кастрычніка 1596 года ў Брэсце ў розных мясцінах сабраліся ўніяты, каб абмеркаваць ужо падпісаны дакумент, і праваслаўныя. Уніяты — у кафедральным саборы, а праваслаўныя, на прыкрыце царкоўнага згодна з каралеўскім указам усіх цэркваў, у прыватным доме. Прынята ўніі аднымі і адвяржэнне другімі адбылося адначасова. Гэта было пачаткам цэлай эпохі, драматычнай і гераічнай.

Цікава, што Дзяніс лічыць сябе нашчадкам з роду знакамітага ўніяцкага полацкага епіскапа Іасафата Кунцэвіча, забітага праваслаўнымі жыхарамі Віцебска і ў хуткім часе кананізаванага каталіцкай царквой.

У людзей, якія не ведаюць духоўнай гісторыі сваёй краіны, а такіх сёння большасць, лічыць Дзяніс, узнікае падманлівае меркаванне, што тут, у Беларусі, заўсёды панавала верацярпімасць і талерантнасць. Аднак гэта не так. За сённяшнюю стабільную і мірную этнаканфесійную сітуацыю заплачана вялікая цана, і не ведаць гэтага — значыць рызыкаваць паўтарыць страшныя памылкі мінулага.

У ходзе сваёй работы Дзяніс праявіў сацыялагічнае апытанне, вынікі якога не менеі цікавыя, чым аналіз даследаванай ім літаратуры.

— Аказалася, — расказвае ён, — што практычна ўсе маладыя людзі, мае аднагодкі, выпускнікі школ, студэнты хочуць ведаць пра хрысціянства і іншыя, традыцыйныя ў нашай краіне, рэлігіі больш. Яны не задаволеныя тым матэрыялам, які даецца ў вучэбных праграмах. І часта не ведаюць, дзе шукаць патрэбную інфармацыю. Практычна ўсе, каго я апытваў, выказаліся за ўвядзенне ў навучальных установах курса духоўнага асветніцтва. Старэйшае пакаленне, тыя, каму пад 50—60, больш абыякавае да гэтай тэмы. Калі падручнікі пішуць апошнія, тады зразумела незадаволенасць маладых.

Але маладыя не хочуць чакаць. Яны пачынаюць з навуковых канферэнцый і, адчуўшы сваю сілу, працягваюць...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Гуляем па «маршрутах бяспекі»,

або Беражыце дзяцей!

Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці правяла чарговае мерапрыемства ў рамках акцыі «Маршруты бяспекі». На гэты раз з павучальнай і забаўляльнай праграмай супрацоўнікі ДАІ наведалі Нацыянальны дзіцячы аздараўленчы лагер «Зубраня».

У актавую залу на цікавую сустрэчу сабралася каля двухсот хлопцаў і дзяўчат. Дзеці ўдзельнічалі ў віктарынах, малявалі машыну ДПС, «рашалі» білеты па правілах дарожнага руху. Дванаццацігадовай Сауле Вінчы можна смела выдаваць вадзіцельскае пасведчанне на матацыкл, бо дзяўчынка правільна і вельмі хутка адказала на пытанні білета. Вясёлымі спевамі і дыскатэкай з запалам парадаваў Дзмітрый Грын — маладая зорка нашай эстрады.

Па статыстыцы, за апошнія шэсць месяцаў на дарогах Міншчыны адбылося 63 дарожна-транспартныя здарэнні з удзелам дзяцей, у якіх загінула сем малых і атрымалі пашкоджанні 60. Таму менавіта ў час летняга адпачынку супрацоўнікі ДАІ кожны тыдзень праводзяць такія прафілактычныя акцыі. У найбліжэйшы час з забаўляльна-павучальнай праграмай Дзяржаўтаінспекцыя наведае лагеры Мінскага і Валожынскага раёнаў.

Самы цікавы для хлопцаў і дзяўчат конкурс — намаляваць машыну ДПС.

Марына БЕГУНКОВА.

Мядзельскі раён.

Фота аўтара.

СІЛА ЁСЦЬ! РОЗУМ НЕ ТРЭБА?

Выпрабавана на сабе

або Пакупнік заўсёды мае рацыю

Малады хлопец. Поўны сілы і жадання працаваць. Пытанне: дзе знайсці працу? Тым больш, што цяпер — лета... Усе самыя вакантныя месцы даўно ўжо занятыя. Большасць маіх знаёмых, якія падпрацоўваюць, пошукамі работы займаліся яшчэ вясной. Цяпер трэба выбраць з таго, што прапануюць. Пасядзеў крыху ў Інтэрнэце... Зразумеў, што застаецца ісці працаваць грузчыкам або ахоўнікам. Што лепш? Напэўна, ахоўнікам... Не трэба насіць цяжкія рэчы. І заробак нядрэнны. Мяркуйце самі.

«Запрашаем ахоўніка ў прыватную арганізацыю. Свабодны графік працы. Патрабаванні: фізічна дужы малады чалавек, без судзімасці, уменне працаваць у калектыве. Можна без вопыту працы (студэнт). Для іншагародніх — дапамога ў рэгістрацыі. Паслугі платнай. Заробак каля 500 долараў».

500 долараў? За такую працу? Нічога сабе... У той момант я і не ўяўляў, што праца ахоўніка, як і любая іншая, не з'яўляецца цукрам. Чым займаюцца ахоўнікі? Стаяць у той жа краме і глядзяць, каб нічога не выкраў. А калі яшчэ і крама невялікая, тады бяры і чытай кнігі. Усё, заўтра ж іду ўладкоўвацца на працу.

Гутарка

10 ДЗЁН ПЕСНЯЎ, ТАНЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Неафіцыйна адкрыўся «базар» юбілейным канцэртам кампазітара Ігара Лучанка «Неспакойнае сэрца». Вядучымі былі легенда расійскай эстрады Іосіф Кабзон — даўні сябар кампазітара, і наша прыгажуня Алена Спірыдовіч. У жніўні Ігару Міхайлавічу споўніцца 70. Не верыцца нават, бо чалавек з энтузіязмам і бурнай творчай дзейнасцю.

Нагадаю, сёлета Летняму амфітэатру — 20 гадоў. Дарэчы, старажылы ўспамінаюць, што сімвалічны ключ ад амфітэатра 20 гадоў таму атрымаў ад будаўнікоў знакаміты кампазітар Марк Фрадкін — зямляк віцябчан. Самае дзіўнае, што ў свой час ён працаваў літаральна насупраць дома, дзе цяпер карпункт «Звязды». Пра гэта мне расказала адна са старэйшых жыхарак Віцебска, якая асабіста ведала кампазітара. Аказваецца, нейкі час ён адказваў за «музычнае жыццё» на фабрыцы лёгкай прамысловасці «Сцяг індустрыялізацыі», дзе шыюць адзенне (калісьці і для ваенных).

Потым адбыўся вечар гумару Максіма Галкіна. А самы першы начны канцэрт, які распачаўся а палове другой ночы, прадставіў публіцы «зорак» «Еўрабачання», сярод якіх быў і апошні пераможца — Дзіма Білан. Выступілі Дыяна Гурцкая, наш Руслан Аляхно і іншыя.

■ ■ ■

Пра канцэрты пісаць — толькі час траціць. Як можна на газетнай паперы перадаць добры настрой, эмоцыі ад ураганняў, прыемных нечаканых і чаканых сустрэч? А каб ніхто не меў непрыемнасцяў, і, нагогул, адчуваў сабе ў «базарныя» дзянькі спакойна, міліцыя вельмі стараецца. Між іншым, упершыню праваахоўныя органы стварылі ў цэнтры фестывальнага Віцебска так званую «чырвоную зону». Пачынаючы з 16 гадзін дня чацвярга ў раён правядзення фестывальных мерапрыемстваў можна прайсці толькі праз «КПП». Што датычыцца аўтамабіляў, яны едуць па тэрыторыі «зоны» на хуткасці не больш за 50 кіламетраў у гадзіну, і спыняцца забаронена.

Фота БЕЛТА.

Адразу па прыездзе Дзіма Білан апынуўся ў цэнтры ўвагі рэпарцёраў.

■ ■ ■

Калі вы, паважаныя чытачы, раптам захочаце прыехаць у Віцебск, ведайце, што няма ў гатэлях свабодных месцаў. Самыя актыўныя перад «базарам» знялі на час фестывалю жыллё. Вельмі шмат гасцей і ў прыватных сядзібах, што недалёка ад абласнога цэнтра, гаспадары якіх могуць не толькі прадаставіць дах, але і прывезці ў фестывальны горад і наадварот.

Для ўстаноў грамадскага харчавання аб'яўлены спецыяльны конкурс на самае лепшае і нестандартнае абслугоўванне. Ды і без таго гандляры пастараліся абслужыць як мага больш наведвальнікаў. Нездарма нават прыказка такая з'явілася — «базар» год корміць!»

Памятаецца, быў час, калі на «базары» была значная праблема, быццам бы простая — не хапала грамадскіх біяпрыбіральняў. Сёлета іх каля 40. Ды і кантэнераў для смецця паставілі дастаткова — больш за 70, што ў два разы больш леташняга. Камунальнікі, як і міліцыянеры, працуюць паводле асобага «базарнага» рэжыма. Як і карэспандэнты «Звязды». Дарэчы, а чаму б вам не стаць сааўтарамі? Мо нейкія падзеі адбыліся на «базары», якія вельмі змянілі ваша жыццё? Тэлефануйце! Пішыце! Жывіце фестывалем!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Сусветны велапрабег за мір

У межах міжнароднага руху за мір і ўзаемадзеянне паміж народамі Еўрапейская арганізацыя «Веласпеад за мір і новыя энергіі» праводзіць гэтым летам трэці велапрабег па маршруце Парыж — Масква — Пекін.

На тэрыторыю Беларусі велапрабег завітае 11 ліпеня з Польшчы, праз кантрольна-прапускны пункт Варшаўскі мост і пройдзе праз гарады Брэст, Камянюкі, Пружаны, Ружаны, Слонім, Баранавічы, Нясвіж, Стоўбцы, Дзяржынск, Мінск, Жодзіна, Барысаў, Крупкі, Талачын, Барань, Орша, Дуброўна, праз пагранпераход Ляды ў Расійскую Федэрацыю. У час знаходжання на тэрыторыі нашай краіны — з 11 па 20 ліпеня — удзельнікі велапрабегу наведаюць памятныя і культурна-гістарычныя мясціны, сустрэнуцца з прадстаўнікамі дзяржаўных, грамадскіх, спартыўных арганізацый, ветэранамі Вялікай Айчыннай.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Пачаўся глабальны маніторынг азёр

Днямі заснавана новая міжнародная структура, якая зоймецца зборам і вывучэннем шматлікіх даных па гідралогіі азёраў і вялікіх вадасховішчаў (HYDROLARE). Тым самым будзе ліквідаваны істотны прабел у сферы назіранняў за запасамі прэснай вады планеты і ў цэлым паляпшэння сістэмы кіравання воднымі рэсурсамі чалавецтва.

Чакаецца, што дзейнасць HYDROLARE дапаможа стымуляваць распрацоўку сістэмы глабальнага маніторынгу азёраў і вадасховішчаў, а таксама паспрыяе ўдасканаленню і аптымізацыі рацыянальнага выкарыстання азёрнай вады. А яе запасы пакуль вялізарныя. Нагадаем, у свеце зарэгістравана больш за чатыры мільёны азёраў. Яны адыгрываюць ключавую ролю ў глабальным водным цыкле і ў навакольным асяроддзі планеты, маюць выключны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае жыццё сотняў мільёнаў людзей. Паводле меркавання экспертаў, патэнцыял прэснаводных азёраў як сховішчаў вады амаль удвая перавышае сярэднестатыстычны гадавы аб'ём ападкаў на ўсёй плошчы сушы Зямлі. Азёры таксама забяспечваюць вадой многія рэгіёны свету.

Леанід ТУГАРЫН.

Крымінал, здарэнні

ДВАЙНЫ НАЕЗД

Жыхар вёскі Гальшаны Ашмянскага раёна, 1979 года нараджэння, загінуў пад коламі двух аўтамабіляў.

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося на дарозе паблізу вёскі Хацежына Мінскага раёна. Спачатку на няшчаснага ўчыніў наезд аўтамабіль «Лексус», якім кіраваў 57-гадовы мінчанін, а пасля пацярпелы патрапіў пад колы «Таёты», за рулём якой знаходзіўся 31-гадовы расіянін.

Ігар ГРЫШЫН.

«ЗЕМЛЯКОПА» ЎЗЯЛІ НА МЯЖЫ

Каб трапіць з Беларусі ў Польшчу, грамадзянін Узбекістана паспрабаваў пранікнуць на тэрыторыю апошняй краіны праз падкоп...

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі, затрымалі парушальніка брэсцкія памежнікі ў той момант, калі ён спрабаваў падкапацца пад электрасігналізацыйны комплекс. Як патлумачыў затрыманы, імкнуўся за мяжу ён у пошуках лепшай долі. Дарэчы, пры сабе ўзбек меў даведку аб вызваленні, выдадзеную Федэральнай службай выканання пакарання Краснаярска (быў асуджаны на 7 гадоў).

Ігар ГРЫШЫН.

Сёння — Сусветны дзень народанасельніцтва

ПЛАНУЙ ТУТ І ЗАРАЗ

Тэмай сёлетняга Сусветнага дня народанасельніцтва стала планаванне сям'і, якое мае на мэце захаваць здароўе жанчын і будучых дзяцей.

Паводле слоў каардынатара праграм ЮНФПА ў Беларусі Таццяны ГАПЛІЧНІК, планаванне сям'і — не проста прымяненне метадаў кантрацэпцыі для папярэджвання цяжарнасці, гэта магчымасць планаваць сваю будучыню і будучыню сваіх дзяцей, магчымасць захаваць здароўе да таго моманту, калі мужчына і жанчына гатовыя да нараджэння дзіцяці і жадаюць гэтага, нарэшце, магчымасць атрымаць задавальненне ад бацькоўства, каб пажадаць паўтарыць гэты дзіўны вопыт яшчэ раз.

Пад вокнамі любога раддома можна ўбачыць жанчын, якія курацьː... Большасць дзяцей па-ранейшаму з'яўляюцца на свет «знянацку»... Не губляюць актуальнасці праблемы высокай колькасці выпадкаў невынашвання цяжарнасці, нараджэння малавагавых дзяцей, бясплоднасці, абортаў (хоць у апошнія гады колькасць апошніх істотна знізілася)... Разам з тым, колькасць самік родаў сур'ёзна павялічылася. Гэта абумоўлена шэрагам розных прычын. Але ж тым не менш факт застаецца фактам: за адны з апошніх сутак толькі ў 2-м мінскім гарадскім радзільным доме мелі месца 27 родаў!

Як адзначае галоўны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Святлана ШЫЛАВА, паляпшэнню нараджальнасці і змяншэнню выпадкаў абортаў закліканы паспрыяць службы планавання сям'і. Гэтай праблематыкай займаюцца як акушэры-гінеколагі жаночых кансультацый, так і гарадскія цэнтры планавання сям'і, створаныя ў сталіцы і ва ўсіх абласных гарадах, а таксама аддзяленне планавання сям'і і дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця». Для моладзі да 18 гадоў функцыянуюць цэнтры дружалюбных аднасінаў да падлеткаў. Трапіць у падобныя структуры можна не толькі па накіраванні, але і па ўласным жаданні. Сёння спецыялісты гатовыя дапамагчы спланаваць сям'ю любой пары, мужчыну і жанчыне. Калі толькі яны ўсведамляюць, што поспех справы ў канчатковым выніку залежыць ад уласных намаганняў, якія давядзецца прыкласці.

ПЛАНАВАННЕ СЯМ'І ДАЗВАЛЯЕ:

1. *абараніць сябе ад інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам;*

2. *атрымаць шанц нарадзіць здаровае дзіця (так, забеспячэнне нармальнага функцыянавання рэпрадуктыўнай сістэмы з улікам узросту бацькоў дазваляе скараціць смяротнасць плода і дзяцей ва ўзросце да 1 тыдня ў два разы);*

3. *папярэдзіць непажаданую цяжарнасць (45 працэнтаў жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту выкарыстоўваюць розныя метады кантрацэпцыі: паспрабуйце самі адказаць на пытанне, ці дастаткова гэта).*

Святлана БАРЫСЕНКА.

Прамая лінія

БЕЗ ЦЫРОЗУ І ГАСТРЫТУ, ЯЗВЫ І ПАНКРЭАТЫТУ

На пытанні чытачоў адказвае дацэнт 2-й кафедры ўнутраных хваробаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Мікалай КАПРАЛАЎ

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 5, 8 —10 ліпеня.)

☎ — Іна Георгіеўна з Лепеля тэлефануе. Сем гадоў таму выявілі язву 12-перснай кішкі. З таго часу амаль кожны год пры абследаванні выяўляюць актыўны бульбіт і адкрытую язву. У момант абвастрэння адчуваю галодныя болі. З першых дзён прыёму лекавых прэпаратаў і праходжання фізіяпрацэдур боль знікае. Пасля стацыянарнага лячэння — паспяховае рубцаванне язвы, але ўсё гэта часова. Чула, што гэта можа быць з-за няправільнага харчавання. Якая дыета мне патрабуецца?

— Вам не праведзена эрадыкацыя — лячэнне па вынішчэнні Helicobacter pylori. Дуадэнальныя язвы да ста працэнтаў выпадкаў звязаны з гэтай бактэрыяй, страўнікавыя язвы, напрыклад, абумоўлены ёю толькі ў палове выпадкаў. Калі бактэрыя вынішчана, то магчымасць рэцыдыву захворвання складае ад 1 да 5 працэнтаў на працягу года, калі ж не, — язву проста залячылі, то рэцыдывы — да 90 працэнтаў. Такім чынам Helicobacter pylori не толькі выклікае язву, але і фарміруе абвастрэнні. Мы карыстаемся спецыяльнай схемай лячэння. Яна досыць жорсткая, стандартная па дозах. Лячэнне праводзіцца на працягу 7—14 дзён з выкарыстаннем антысакраторнага прэпарата і двух антыбіётыкаў — ларытрамецыну, які ў аптэчнай сетцы прадаецца пад назвамі кларыкар, кларымед, і амаксіцыліну. Антыбіётыкі прызначаюцца ў вельмі вялікіх дозах, таму працэс лячэння нельга назваць лёгкім.

Неабходна заўважыць, што да 50—60 працэнтаў беларускага насельніцтва інфіцыраваны Helicobacter pylori. Прыкладна ў 20 працэнтаў з іх ніякіх арганічных змяненняў у страўніку і слізістай не ўзнікае, паколькі значэнне мае імунітэт, штам мікраарганізма. Бактэрыя можа існаваць у 20 варыянтах: адны з іх — не патагенныя, другія — умоўна патагенныя. Аднак калі чалавек будзе злоўжываць алкаголем, дрэнна харчавацца, то любая бактэрыя можа стаць актыўнай.

☎ — Таццяна, Мядзел. Ці можа гастрыт прайсці сам па сабе?

— Гастрыт з эрозіямі — разбуральнае слізістай — лічыцца захворваннем. Але ў кожнага чалавека з узростам могуць быць выяўлены і проста пэўныя змяненні, узрастаюць атрафія. Калі ж гаворка ідзе аб функцыянальнай страўнікавай дыспепсіі, то боль у дадзеным выпадку фарміруе парушэнне маторнай і скарачальнай функцый верхняга аддзела страўнікава-кішачнага тракта. Гэта ўжо паталагічны працэс. І гэта новае ўяўленне, раней так не лічылі. Цяпер у такіх выпадках мы рэгулюем маторную і эвакуаторную функцыі верхняга аддзела страўнікава-кішачнага тракта і дабіваемся добрых вынікаў.

— Ці заўсёды з гастрыту развіваецца язва?

— Варта адрозніваць просты гастрыт — калі толькі з'яўляюцца ўзроставыя змяненні, і гастрыт з эрозіямі, што, паводле еўрапейскіх уяўленняў, і ёсць павярхоўная язва. Таму ў першым выпадку наогул няма ніякай сувязі паміж гэтымі дзвюма з'явамі, а ў другім — гэта, па сутнасці, адно і тое ж.

— А можа язва перайсці ў рак?

— Можа быць язва-рак. Дарэчы, язва можа не перайсці ў рак, а проста рак у страўніку можа быць у выглядзе язвы. Такія формы раку даволі часта дыягнастуюцца намі. Акрамя таго, адным з ускладненняў язвы з'яўляецца перараджэнне ў рак. Гэта здараецца не часта.

☎ — Ірына, Віцебская вобласць. У мяне — панкрэатыт. Якія прадукты неабходна ўжываць пры гэтым захворванні?

— Калі дыягназ пастаўлены правільна, то вам паказаны стол № 5. Выдаляецца з рацыёну алкаголь, паколькі гэта адзін з галоўных фактараў развіцця панкрэатыту. Выдаляецца тлустая, салёная, вострая, вэнджаная ежа, паколькі хранічны панкрэатыт многімі даследчыкамі аднесены да кіслотных хвароб.

☎ — Антаніна Фёдараўна з Магілёва турбуе. Стул часам бывае з кроўю... Наогул часта адчуваю дыскамфорт у кішэчніку. Што параіце рабіць?

— Кроў — грозны сімптом. Неабходна правесці даследаванне, напрыклад, зрабіць рэктасігмаскапію — даследаваць ніжні аддзел кішэчніка. Давядзецца зрабіць і капраграму. Як правіла, стул з кроўю сведчыць аб гемарої, але ўсё ж такі неабходна тэрмінова даследавацца. Што датычыцца дыскамфорту, назапашвання газаў, успушвання жывата, то гэта азначае, што ежа дрэнна ператраўліваецца ў тонкім кішэчніку, што можа быць звязана з недастатковай функцыяй падстраўнікавай залозы, выпрацоўкай належных ферментаў або запаленчым змяненнем у сценках тонкай кішкі.

«Прамую лінію» правялі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

ЛЕКАРКА ГЛІНА

Апошнім часам шмат гавораць пра гаючыя ўласцівасці каляровых глін — белай і шэрай, блакітнай і чырвонай... Як зарыентавацца ў гэтай разнастайнасці «колераў» і вызначыць від гліны, які будзе карысны менавіта вам?

Гліналячэнне — адзін з самых старажытных метадаў аздараўлення. З даўніх часоў людзі ведалі, што гліна паглынае таксіны, пахі, газы і забівае хваробатворныя бактэрыі, здольная абсарбіраваць прадукты жыццядзейнасці клетак арганізма і пры гэтым застаецца хімічна інертнай, а значыць, абсалютна бяскшкоднай для арганізма. Яе ўласцівасці — ачышчальная, антысептычная, стымулюючая і процізапаленчая — выкарыстоўваліся ў медыцыне і касметалогіі. Глінай выратоўваліся пры розных атручэннях, мышачных болях і скурных захворваннях, апёках і язвах, прымаюць яе ўнутр і прымяняючы звонку. Сёння афіцыйная медыцына таксама зварочваецца да гліналячэння пры хранічных хваробах суставаў, пазваночніка, перыферычных нерваў, траўмах, захворваннях жаночай палавой сістэмы і інш. Адметная рыса гліны ў тым, што яна не мае проціпаказанняў і пабочных эфектаў. Некаторыя спецыялісты нетрадыцыйных метадаў лячэння сцвярджаюць, што гліна нават здольная «выроўніваць» аслабленае бясполе чалавека, як экстрасэнс.

Для лячэння прымяняюцца ўсе віды гліны — галоўнае, каб яны былі экалагічна чыстымі. (Па гэтай прычыне гліну лепш набываць у аптэках.) Колер «лекаркі» залежыць ад перавагі ў яе мінеральным складзе таго ці іншага рэчыва: жалеза, медзі, марганцу і інш.

Белая гліна, або каалін, багатая на крэменязём, цынк і магній. Яна дзейнічае як антысептык, актывізуе кровазварот, здымае запаленні. Уплыў кааліну на скуру сапраўды цудадзейны: ён робіць сасуды ў верхніх слаях скуры гібкімі, садзейнічае ўтварэнню калагену, а значыць надае эластычнасць скуры; пазбаўляе ад вугроў. Каалін — далікатны абразіў (эксфаліянт), што дазваляе выкарыстоўваць яго ў якасці мяккага скрабу. Белая гліна здымае зубныя камяні, умацоўвае эмаль, адбельвае зубы.

Блакітная — самая каштоўная з глін, змяшчае ў сабе солі кадмію і кобальту. Яна нармалізуе абмен рэчывай, лечыць атлусценне, уздуцце жывата, жаўтуху, анемію, атэрасклероз, дабратворна дзейнічае на скуру і пазногці. Звонку блакітную гліну выкарыстоўваюць пры лячэнні радыкуліту, рэўматызму, артрыту, хвароб мышцаў і сухажылля, балючых менструацый і прастатыту. Эфектыўны сродак у барацьбе з аблысеннем.

Жоўтая «лекарка» багатая на жалеза, кальцый, натрый, серу. Дапамагае пры галаўных болях, інсульце, астэахандрозе. Выводзіць таксіны і насычае скуру кіслародам.

Зялёная гліна афарбавана аксідам жалеза, змяшчае магній, кальцый, цынк. Найбольш падыходзіць для тлустай скуры твару. Садзейнічае звужэнню пор і паляпшае функцыю сальных залозаў, пазбаўляе ад пархаці, здымае ацёчнасць.

Чырвоны колер гліны абумоўлены наяўнасцю ў ёй складзе мінералу гематыту; акрамя таго, яна ўтрымлівае магній, жалеза, медзь. Чырвоная гліна эфектыўная пры сардэчна-сасудзістых захворваннях, гіпатаніі, варыкозе. Паляпшае кровазабеспячэнне скуры, лечыць алергію; рэкамендуецца пры адчувальнай, схільнай да пачырванення скуры. Выкарыстоўваецца пры недахопе жалеза ў арганізме.

Шэрая гліна мае такую афарбоўку з-за прысутнасці ў ёй вугляродзістых рэчываў і жалеза. Прымяняецца з мэтай зніжэння тэмпературы цела, пры сэрцабіцці (арытміі), пры запаленчых захворваннях скуры, артрозах; увільгатняе і амалоджвае скуру.

«ГЛІНЯНЫЯ» РЭЦЭПТЫ Ў МЕДЫЦЫНЕ...

Народныя лекары рэкамендуюць гліну ў выглядзе аплікацый. Глінены парашок разводзяць да кансістэнцыі масцікі, фармуюць пласціну таўшчынёй 1—1,5 см, кладуць на вільготную бавоўняную тканіну і зверху ўцяпляюць (напрыклад, цёплым шарсцяным шалікам). Трымаюць аплікацыю каля 2 гадзін, затым хворае месца прамываюць цёплай вадой. Колькасць працэдур залежыць ад стану хворага.

■ Пры бранхіце праводзіцца 2-тыднёвы курс глінатэрапіі. Глінявыя аплікацыі, памерам крыху больш чым далонь, штодзень накладваюць на вобласць ніжэй лапатак 1 раз на дзень.

■ Пры гаймарыце на вобласць гаймаравых пазух кладуць аплікацыі з гліны таўшчынёй 1 см штодзень. Курс лячэння — 3 тыдні.

■ Пры артрыце рэкамендуюцца расціранні з дапамогай глінянай вады: намачыць растворам гліны вялікі ватны тампон і расціраць ім хворае месца. Каб узмацніць дзеянне расцірання, у раствор варта дадаць 2—3 долькі здробненага часнаку.

■ Пры бяссонніцы пакласці на вобласць ілба халодны кампрэс з гліны, добра размешанай у прастаквашы.

■ Пры бародаўках рабіць па вечарах прымочкі з гліны і дзёртага часнаку.

■ Пры апёках на пашкоджаныя месцы накладваць добра прамочаныя глінянай вадой сурвэткі, мяняць кожныя 2 гадзіны.

■ Пры насмарку ў нос закапаць гліняную ваду, ноздры заціснуць, а галаву некалькі разоў нахіліць наперад—назад. Затым добра высмаркаць нос і паўтарыць працэдуру яшчэ 2 разы.

... У КАСМЕТАЛОГІІ

■ Маска для сухой скуры: змяшаць 1 ст. лыжку белай гліны з 1 ч. лыжкай вадкага мёду і ахаладжанай гатаванай вадой (ад гарачай гліна страчвае свае карысныя ўласцівасці). Змыць маску праз 30 хвілін.

■ Ад чорных кропак на твары: 2—3 лыжкі аптэчнай гліны развесці ў чвэрці шклянкі гарэлкі і дадаць сок паловы лімону. Нанесці на праблемныя ўчасткі на 10—12 хвілін, затым змыць цёплай вадой.

■ Маска адбельваючая: надзярыце на тарцы невялікі кавалак свежага агурка і змяшайце з белай глінай.

■ Маска для валасоў: 50—100 г гліны развесці вадой, нанесці на сухія валасы, ухутаць ручніком. Праз 20 хвілін прамыць вадой.

■ Маска для цела: змяшаць гліну з вадой; не выкарыстоўваючы металічных прылад, добра яе перамяшаць да кансістэнцыі смятаны. Змазаць гэтай масай усё цела і пабыць у такім стане 20—30 хвілін. Затым прыняць цёплы душ.

■ Ванна з глінай: растварыць 500 г белай або блакітнай гліны ў ванне з цёплай вадой. Працягласць працэдуры — 15—20 хвілін, пасля чаго апаласнуцца пад душам без прымянення мыла.

УВАГА! Выкарыстаную гліну ніколі не прымяняйце паўторна. Лічыцца, што лепш за ўсё закапаць яе ў зямлі — разам з хваробамі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

«Белтэлекам» станцуе сальсу

Другі год запар «Белтэлекам» выступае афіцыйным партнёрам фестывалю «Славянскі базар у Віцебску». Як звычайна, кампанія дапамагае ў арганізацыі прэс-цэнтра і доступу ў Інтэрнэт для прэсы, а таксама ўсіх гасцей горада ў фестывальныя дні.

Акрамя тэхнічнай падтрымкі, «Белтэлекам» арганізуе ўласную праграму ўдзелу на «Славянскім базары». 11—18 ліпеня будзе арганізаваны прома-тур, падчас якога наведвальнікі фестывалю змогуць атрымаць падрабязную інфармацыю аб месцах, дзе ёсць Wi-Fi, Інтэрнэт, таксафоны з уваходзячай сувяззю і іншыя паслугі аператара сувязі «Белтэлекам». 17 ліпеня кампанія запросіць усіх ахвотнікаў на Salsa-шоў. Сальса — гэта адзін з самых папулярных лацінаамерыканскіх танцаў ва ўсім свеце. Знаўцы сальсы нават сцвярджаюць, што гэта не проста танец, а стыль жыцця, спосаб знаёмства, манера зносінаў. «Белтэлекам» арганізуе майстар-класы па сальсе ад лепшых майстроў лацінаамерыканскіх танцаў — для тых, хто хоча навучыцца. Танчаць усе!

Сяргей РАСОЛЬКА.

Як аўтарская «Купалінка» стала народнай песняй?

Версіі

Адказ на гэтае пытанне прапанаваў студэнт Беларускай акадэміі музыкі Максім Іўкін. Яго даследаванне стала адкрыццём нават для музыказнаўцаў і прагучала як сенсацыя

Гэтая песня суправаджае нас усюды: з дзяцінства мы чуем яе па радыё, тэлебачанні, у тэатры (першыя такты «Купалінкі» і цяпер гучаць у Купалаўскім тэатры заміж тэатральных званкоў), яе спяваюць людзі падчас святаў і застолляў. Яна даўно ўжо стала адной з самых вядомых і любімых песень, нават прадстаўляе сёння твар беларускага фальклору. І сапраўды, здаецца, што гэтая напеўная, выразная мелодыя наскрозь прасякнутая беларускім народным духам, сплецёная з беларускіх народных інтанацый і праўдзіва выказвае самую сутнасць душы народа. Безумоўна, так яно і ёсць, за выключэннем аднаго: сёння ўжо з упэўненасцю можна сказаць, што ў гэтай песні, як і ў некаторых іншых, якія яшчэ нядаўна лічыліся народнымі, напрыклад, «Люблю наш край» М. Равенскага і «Зорка Венера» С. Рака-Міхайлоўскага, ёсць рэальныя прафесійныя аўтары. Іх імя на доўгі час было выкрасленае з гісторыі беларускай культуры. Такі ж лёс напаткаў аўтара «Купалінкі». Але немагчыма было забараніць яго песню, якая пайшла ў народ...

Адным з найбольш папулярных і па сёння зборнікаў беларускіх песень з'яўляецца «Анталогія беларускай народнай песні», складзеная Генадзем Цітовічам, выдадзеная ў 1968 годзе. У падраздзеле «Каляндарна-абрадавыя песні» раздзела «Песні дасавецкага перыяду» пад № 39 змешчаная славутая беларуская «Купалінка». *«Напеў навейшага паходжання, аб чым гаворыць яго інтанацыйная пабудова, якая адрозніваецца ад традыцыйнай мелодыкі купальскіх песень, і многагалоссе»,* — сцвярджаецца ў каментарыях складальніка. Пазначаная і крыніца публікацыі: «Песні беларускага народа». І ў «Анталогіі», і ў зборніку «Выбранае» 1959 года выдання, дзе ёсць каментарыі самога Генадзя Цітовіча, змешчаны мінімум пашпартных звестак аб напеве. Адзначана толькі, што песня запісаная Уладзімірам Тэраўскім у Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці.

Цікава параўнаць гэтыя звесткі са звесткамі «Зборніка купальскіх і жніўных беларускіх песняў», які быў выдадзены кампазітарам Міколам Шчагловым. Сярод трыццаці нумароў зборніка змешчаныя 26 апрацовак укладальніка, дзве — Туранкова і адна апрацоўка Прохарава. Дзевятым жа нумарам пазначаная «Купалінка» — вядомы ўсім напеў, але з невялічкім адрозненнем у тэксце — з музыкай... Уладзіміра Тэраўскага!

Уладзімір Тэраўскі адзін з тых асобаў, якія стаялі ля вытокаў стварэння нацыянальнай оперы і нацыянальнай музычнай школы. Тэраўскі — колішні ўдзельнік славутага хору Агрэнёва-Славянскага. Але ён стаў стваральнікам першых нацыянальных хароў. Сам дырыжыраваць харамі Тэраўскі пачаў яшчэ ў 16—17-гадовым узросце. Ім быў арганізаваны першы беларускі хор яшчэ перад Першай Сусветнай вайной, у ліпені 1914 г. Славуты беларускі хор пад кіраўніцтвам Уладзіміра Тэраўскага ўваходзіў у склад Першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Дзяржаўнага тэатра БНР, Беларускага Савецкага тэатра, а таксама выступаў самастойна. *«Можна адзначыць, зусім не хвалячыся, што гэткім знамянітым хорам магла б гардзіцца любая нацыя, — адзначаў Змітрок Бядуля яшчэ ў 1920 г. — Пан Тэраўскі — мастак, самародак. Чары і гармонія беларускіх народных песняў захапілі яго душу. Добра ведаючы дух нашых мелодыяў, ён іх стылізуе так, як лепей не трэба. Апроч таго, ён сам вельмі ўдачна піша новыя песні ў беларускім характары».*

Частка гэтых стылізацый і «новых песень у беларускім характары» , якія стварыў Тэраўскі, былі надрукаваныя ім у зборніках «Беларускі сьпеўнік» 1921 года, у «Беларускім лірніку», які быў выдадзены ў Берліне ў 1922 годзе, і ў «Вайсковым зборніку», які выйшаў у Мінску ў 1926 годзе. Уладзімір Тэраўскі стварыў свае «новыя песні» не толькі на словы вядомых паэтаў і драматургаў, такіх, як Купала, Дунін-Марцінкевіч, але і на традыцыйна народныя тэксты. Але важнасць і колькасць зробленага Уладзімірам Тэраўскім на ніве стварэння нацыянальнага музычнага рэпертуару не ўратавалі яго ад пераследаў і рэпрэсій. Выхад у свет другога з адзначаных спеўнікаў Тэраўскі сустрэў ужо за кратамі смаленскай турмы. На такое пакаранне быў зменены папярэдне вынесены яму «за антысавецкую дзейнасць» прысуд да расстрэлу.

Пад рэпрэсіі трапілі тады не толькі асоба, але і некаторыя творы кампазітара, найперш ягоны «Ваяцкі марш».

Дарэчы, у 1922 годзе была створана арганізацыя, якая аб'яднала ў сваіх руках усе віды савецкай цэнзуры — Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў, у Беларусі — Галоўлітбел. Паказальным для дзейнасці гэтай арганізацыі з'яўляецца, да прыкладу, рашэнне Галоўлітбела ад 29.11.1932 г. «об изъятии из продажи и музыкальных библиотек народных песен с нотами «А ў бары, бары», «А ў лесе, лесе», «Мужык жыта прадае», а также песен на слова Янкі Купалы «Лісты валяцца», «У імгле» и Максима Богдановича «Як прыйшла я на ток малаціць».

Калі так палохалі ўладу песні, то, напэўна, баялася яна і асобаў, якія гэтыя песні стваралі, любілі, збіралі. І ўсё было зроблена для таго, каб была знішчана памяць аб многіх значных аўтарах. У тым ліку — памяць пра Тэраўскага. Яго імя перасталі звязваць з «Купалінкай». Песня рэпрэсаванага аўтара стала лічыцца народнай.

Пасля афіцыйнай рэабілітацыі Уладзіміра Тэраўскага прайшло ўжо больш за паўстагоддзя. Але аўтарства вядомага напеву вярталася нашмат цяжэй. Напэўна, за таго, што насамрэч традыцыйны, фальклорны тэкст песні быў вельмі ўдала стылізаваны яшчэ адным рэпрэсаваным дзеячам нашай культуры — Міхасём Чаротам. Адной з найбольш вядомых яго творчых прац была бліскучая пастаўленая Еўсцігнеем Міровічам у 1921 годзе музычная драма «На Купалле». Тэкст яе доўгі час лічыўся страчаным і толькі ў 1982 годзе быў адноўлены па памяці колішнімі ўдзельнікамі пастаноўкі К. Кулаковым і К. Пуроўскім, ён быў надрукаваны ў часопісе «Полымя». Менавіта там мы знойдзем арыгінальны варыянт тэксту «Купалінкі».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Бо «Купалінка» была ўсяго толькі адным з нумароў гэтае сапраўды народнае драмы, аўтарамі якой сталі Міхась Чарот і Уладзімір Тэраўскі. Па падліках таго ж Пуроўскага, спектакль «На Купалле» адно толькі ў 1920-я гады вытрымаў ажно 432 паказы!..

На сёння музычная драма Чарота — Тэраўскага заслужана прызнаецца за вяршыню музычнай творчасці кампазітара.

Аб тым, што «Купалінка» была створаная Уладзімірам Тэраўскім спецыяльна да п'есы М. Чарота, адзначалася ў нарысе Ючўанкі «Музыка ў пастаноўках драматычных тэатраў» у 1993 годзе. «Купалінка» Тэраўскага згадваецца ў артыкуле Святланы Берасцень — у апісанні «Зборніка купальскіх і жніўных беларускіх песняў» Шчагловa.

І ўсё-ткі яшчэ і праз 15 гадоў пасля гэтых публікацый аўтарства «Купалінкі» застаецца, на жаль, схаваным ад грамадскасці. Няхай прагучыць нарэшце ўголас імя аўтара гэтае славутае песні — **Уладзімір Тэраўскі.**

Максім ІЎКІН.

Песня № 1

Свой даклад, прысвечаны гэтай тэме, Максім Іўкін прамовіў на навуковых чытаннях памяці Мухарынскай у Беларускай акадэміі музыкі. Ён прысвяціў яго памяці Тэраўскага, чалавека, які быў расстраляны 70 гадоў таму, за два тыдні і тры гады да свайго 70-годдзя. Такім чынам, забытае імя кампазітара мінулых дзён дапамог вярнуць будучы кампазітар.

— Максім, вы рыхтуецеся стаць прафесійным кампазітарам, а чаму вас зацікавіла паходжанне песні, якая лічылася народнай?

— Я вельмі даўно цікавіўся і займаўся фальклорам, сам збіраў, запісваў яго, ездзіў у экспедыцыі. Для мяне гэта ўсё вельмі блізка. Да «Купалінкі» я звярнуўся дзякуючы выкладчыцы беларускай музыкі Тамары Ліхач. Яна прыносіла цікавыя ноты, якія мелі дачыненне да музыкі XX стагоддзя, і неяк, калі мы вывучалі Тэраўскага, яна прынесла раздрукаваны зборнічак Шчаглова. Я зрабіў з яго сабе копію. А пасля ўважліва перагледзеў змест. І звярнуў вагу на дробненькія літары ў месцы, якімі было пазначана аўтарства гарманізацыі, ці аўтарства музыкі. Гэта рэдкае выданне, яно захоўваецца ў Коласаўскай бібліятэцы. Там маленечкімі літарамі пазначана: муз. У. Тэраўскага. За гэта я і зачапіўся, пачаў капаць далей, аналізаваў, сядзеў у бібліятэках. Перагледзеў шмат матэрыялаў у кабінеце народнай музыкі ў нас у акадэміі. Некаторыя рэчы траплялі, быццам бы нехта з вышыні падказваў. Некаторыя звесткі прыходзілі, я лічу, зусім не выпадкова. Даследчыкі спецыяльна можа і не звярталі б увагі, але я капаў мэтанакіравана. Спачатку нарадзілася гіпотэза, а потым усё яе пацвярджала. Паступова ўсё складалася ў нейкую агульную карцінку. І калі ўжо назапасілася вельмі шмат матэрыялу, заставалася ўсё аформіць, каб гэта прагучала пераканаўча. Насамрэч, постаць Уладзіміра Тэраўскага быццам бы і вядомая, але не займае таго месца, якое, на маё меркаванне, павінна займаць. Таму што Уладзімір Тэраўскі — чалавек, які заклаў асновы беларускай музычнай школы, менавіта нацыянальны накірунак ім быў вызначаны.

— Вы адзначаеце, што ў «Купалінкі» найноўшая мелодыя. Няўжо можна адчуць, што яна не народная?

— Так, сапраўды можна адчуць... Вы чулі калі-небудзь аўтэнтычныя спевы?.. Гэта абсалют

Чытайце ў наступным нумары

Каму прадаць парэчку?

У віцебскі карпункт «Звязды» звярнуўся жыхар Аршанскага раёна і ўзняў праблему збыту ягад.

Паводле яго слоў, аршанскае і віцебскае прадпрыемствы аб'явілі, што за кожны кілаграм чорнай парэчкі заплацяць толькі 1000 рублёў. Такая цана была і летась. Несур'ёзна. А вось у суседняй Расіі – у Смаленскай вобласці — плацяць за беларускую парэчку і іншыя ягады добра. Вось і вывозяць ягаду за мяжу. Проста вымушаны паступаць «так не патрыятычна»…

Калі сітуацыя з закупачнымі цэнамі не зменіцца, можам увогуле застацца без парэчкі. А купляць у той жа Расіі – нашу!

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.52	21.37	16.45
Віцебск —	4.34	21.35	17.01
Магілёў —	4.42	21.28	16.46
Гомель —	4.48	21.15	16.27
Гродна —	5.09	21.51	16.42
Брэст —	5.18	21.43	16.25

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Германа, Івана, Паўла, Сяргея.*

К. *Вольгі, Карыны, Пелагеі, Бенядзікта, Пятра.*

НАДВОР'Е на заўтра



КУП «Минский областной центр недвижимости»

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже, обращенного в доход государства здания столовой, об. пл. 686,9 кв.м, расположенного по адресу: Воложинский район, д. Гончары. Начальная цена снижена на 10 % и составляет – 161 780 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 29 июля 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 28 июля 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.

УНП 690324015

Филиалу «Нерудстройматериалы»
РУП «Дорстройиндустрия»

срочно требуются на работу вахтовым методом:

1. МАШИНИСТ ЭКСКАВАТОРА;
2. МАШИНИСТЫ БУЛЬДОЗЕРА;
3. ВОДИТЕЛИ ГРУЗОВЫХ АВТОМОБИЛЕЙ (МАЗ, БЕЛАЗ).

Зарплата 1 500 000 руб.

СПРАВКИ ПО ТЕЛЕФОНАМ:
(8017) 210 00 58 приемная,
(801716) 7 55 48 — отдел кадров.

УНП 601059799

ЧЫМ ТАБЛЕТКУ ПРАГЛЫНУЦЬ — ЛЕПШ ПРЫПЕЎКУ ЗАЦЯГНУЦЬ

Чаравічкі мае,
Абцасікі сцёрла.
Каб не пела, не скакала,
Дык даўно б памёрла,

— дзеліцца сакрэтам бадзёрасці 72-гадовая Ніна Мінчукова, самая старэйшая ўдзельніца раённага конкурсу гарманістаў і выканаўцаў народных прыпевак, які прайшоў у Маладзечне падчас святкавання 620-годдзя горада. Следам за жанчынай кожны з удзельнікаў абавязкова адзначаў «лекавыя» якасці прыпевак, ад якіх, аказваецца, і ціск нармалізуецца, і праца хутчэй ідзе, і настрой увесь дзень застаецца добрым.

Калі прыняць гэта на веру, то Ніна Іванаўна павінна быць самай здаровай і вясёлай з усіх, бо і прыпевак яна ведае больш, чым іншыя — каля сямісот! Сярод іх — і народныя, якія спявала яшчэ яе бабуля, і свае, аўтарскія. Не дзіўна, што студэнты з магнітафонамі — частыя госці ў доме Ніны Іванаўны: не адна дыпломная работа была напісаная з яе дапамогай.

Знаходзяць прымяненне свайму таленту і іншыя ўдзельніцы свята — дзве Марыі з вёскі Раёўшчына — Лосева і Галюк. Яны прыехалі на мерапрыемства з вяселля, дзе пад дружны смех гасцей давалі маладым жартоўныя парады. Такую ж рэакцыю выклікала іх апошняя конкурсная прыпеўка, калі дзве вясёлыя бабулькі папрасілі ва ўсіх прысутных мужчын, каб хутчэй звярнулі на іх увагу, бо «моладасць канчаецца!»

— У гэтай народнай прыпеўкі, як і ў многіх іншых, ёсць яшчэ адзін варыянт, не надта прыстойны, — прызналася адна з Марый. — Мы вельмі баяліся, каб не збіцца на яго!

Свае цяжкасці меў і калектыў, які атрымаў прыз сімпатый гледачоў, — сямейны дуэт з Турэц-Баяр, Тамара Мікуліч і Мікалай Кузняцоў:

— Мой муж — расіянін, таму некаторыя беларускія слоўцы запамяталіся яму вельмі цяжка. Напрыклад, замест таго, каб праспяваць «Наша вуліца шырока, у канцы — вялікі бэз», ён спяваў «бес», бо гэта слова яму больш знаёмае.

Тамара Генадзьеўна і Мікалай Васільевіч даўно гастралююць парай. Вось і цяпер: кароў навязалі — і на конкурс.

— Ці знойдзем яе, калі прыедзем? — турбуецца прыпевачнік.

Але ўсё ж такі творчасць для іх важнейшая за хатнія справы. На шчасце, яшчэ не перавяліся людзі, якія разумеюць: без гумару і без добрага настрою сёння пражыць куды больш складана, чым без каровы.

Віктарыя КРУПЯНЬКОВА.
Фота аўтара.

На фота: Тамара МІКУЛІЧ і Мікалай КУЗНЯЦОЎ усё робяць разам: і гаспадарку вядуць, і прыпеўкі спяваюць; рэцэпт добрага настрою ад Ніны МІНЧУКОВАЙ — «рукі ў бокі і — у скокі».

НАРОД СПЯВАЕ...

...пра моладзь.
Раней косы запляталі,
Цяпер ходзяць з чолкамі.
Раней душачкамі звалі,
Цяпер проста — цёлкамі.
...пра бацькоў і дзяцей.
Гадавала сваіх дзетак,
А цяпер жыву адна.
Каб дазвацца ў адведкі,
Трэба рэзаць кабана.
...пра сябе.
Пасадзіла петуха,
Пасадзіла курыцу,
Палажыла дзеда спаць —
А сама на вуліцу.

ЗАО «Дельта Банк»

220036, г. Минск, ул. Розы Люксембург, 95. Тел. 256-19-08
www.deltabank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2008 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2008	01.07.2007
1	*2*	*3*	*4*	*5*
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	—	—
3	Средства в Национальном банке	1102	4 581,9	14,5
4	Ценные бумаги:	1103	—	—
	для торговли	11031	—	—
	удерживаемые до погашения	11032	—	—
	в наличии для продажи	11033	—	—
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	25 007,6	6,4
6	Кредиты клиентам	1106	55 258,0	37,2
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	551,4	—
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	9 652,3	411,3
9	Прочие активы	1109	3 907,9	924,7
10	ИТОГО активы	110	98 959,2	1 394,1
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	—	—
13	Кредиты и другие средства банков	1205	19 161,9	—
14	Средства клиентов	1206	9 089,3	619,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	—	—
16	Прочие обязательства	1209	6 201,2	88,7
17	ВСЕГО обязательства	120	34 452,4	708,3
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	64 000,0	800,0
20	Эмиссионный доход	1212	—	—
21	Резервный фонд	1213	260,0	120,0
22	Накопленная прибыль	1214	86,0	(-370,0)
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	160,8	135,8
24	ВСЕГО капитал	121	64 506,8	685,8
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	98 959,2	1 394,1
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	6 375,8	—
28	Обязательства	1302	42 485,1	—

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2008 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2008	01.07.2007
1	*2*	*3*	*4*	*5*
1	Процентные доходы	2011	1 874,3	106,9
2	Процентные расходы	2012	239,1	0,3
3	Чистые процентные доходы	201	1 635,2	106,6
4	Комиссионные доходы	2021	6 111,3	12,4
5	Комиссионные расходы	2022	57,4	3,3
6	Чистые комиссионные доходы	202	6 053,9	9,1
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	1 823,2	5,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	—	—
9	Доход в форме дивидендов	205	—	—
10	Чистые отчисления в резервы	206	109,1	(-142,3)
11	Прочие доходы	207	3 635,8	12,5
12	Операционные расходы	208	12 879,5	560,3
13	Прочие расходы	209	95,1	22,6
14	Налог на прибыль	210	1 635,2	—
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	58,3	(-306,8)

Председатель Правления **Партнова И.С.**
Главный бухгалтер **Миркевич С.И.**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 27 от 01.09.2007 г. УНП 807000015

Дзве даты

11 ліпеня

1921 год — у Мінску ўрачыста абвешчана аб адкрыцці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, першай вышэйшай навучальнай установы ў рэспубліцы. Рашэнне аб адкрыцці ўніверсітэта было прынята яшчэ 25 лютага 1919 года, але з-за акупацыі тэрыторыі Беларусі запланаваныя тэрміны адкрыцця былі сарваны. Вясной 1921 года прынята рашэнне аб адкрыцці рабочага, грамадскіх навук і медыцынскага факультэтаў. 8 ліпеня назначана кіраўніцтва ўніверсітэта, першым рэктарам БДУ стаў Уладзімір Пічэта. Адкрыццё ўніверсітэта адбылося 30 кастрычніка 1921 года.

1903 год — нарадзіўся Рудольф Іванавіч Абель (сапр. Уільям Генрыхавіч Фішэр), выдатны савецкі разведчык, легенда «халоднай вайны». З 1927 года працуе ў органах дзяржбяспекі СССР. У прафесійнай дзейнасці разведчыка можна выдзеліць два этапы, у час якіх ён аказаў краіне неацэнныя паслугі. Першы — ваенных гадоў: удзел у аперацыі «Беразіно» на тэрыторыі Беларусі. Тады савецкая разведка стварыла фіктыўную нямецкую групоўку палкоўніка Шорхарна, якая быццам бы дзейнічала ў нашым тыле. Гэта была пастка для нямецкіх разведчыкаў і дыверсантаў. У дапамогу Шорхарну Ота Скарцэні скінуў больш як 20 агентаў, усе яны ў выніку віртуознай радыёгульні, за якую адказваў Абель, былі захоплены. Другі этап — удзел Абеля ў «паляванні» за амерыканскімі атамнымі сакрэтамі. Нашы вучоныя і самі стварылі б бомбу, без дапамогі разведчыкаў. Але навуковы пошук — гэта трата сілаў, часу, грошай. Дзякуючы Абелю ўдалося пазбегнуць тупіковых даследаванняў, і патрэбны вынік быў атрыманы ў найкарацейшыя тэрміны. Савецкі Саюз устанавіў парытэт са Злучанымі Штатамі, сарваўшы планы ЗША па нанясенні прэвентыўнага ядзернага ўдару па нашых гарадах, намечанага на студзень 1950 года. У 1957 годзе разведчык быў арыштаваны ў ЗША і асуджаны да 30 гадоў катаржнай турмы. Праз пяць гадоў вярнуўся ў СССР у выніку абмену на амерыканскага лётчыка Ф. Паўэрса, збітага 1 мая 1960 года ў савецкай паветранай прасторы.

Цытата дня:

«У каханні ёсць дэспатызм і рабства. І найбольш дэспатычным з'яўляецца каханне жаночае: яно патрабуе сабе ўсяго».

Мікалай Бярдзяеў (1874—1948), рускі рэлігійны філосаф.

Усміхнёмся!

На ўсіх зімовых алімпіядах перамагаюць фіны і шведы, бо яшчэ са старажытных часоў яны на лыжах уцякалі ад рускіх.

☺

Буйны чыноўнік у Маскве на аўтамабілі збівае двух чалавек на пешаходным пераходзе і пытаецца ў суддзі:

— Якія будуць наступствы?

— Ну, таму, хто галавой лабавое шкло прабіў — 5 гадоў турмы за нападзенне і спробу рабавання, а таму, хто ў кусты паляцеў, можна і ўсе 8 — яшчэ і за спробу збегчы з месца злачынства.

☺

Дрэнны той кітайскі фільм пра Шаалінь, у якім слова «настаўнік» гавораць менш за 800 разоў.

☺

Сын — бацьку:

— Тата, колькі мне спатрэбіцца грошай, каб ажаніцца?

— Не ведаю, сынок. Я да гэтай пары выплачваю...

☺

А некаторыя бабулькі нават спецыяльна прагноз слухаюць, калі магнітныя буры будуць, каб ведаць, калі сябе дрэнна адчуваць.

Здарэнні

Садок напалохалі восы

Яны пасяліліся клубком пад ганкам будынка і да пэўнага часу паводзілі сябе спакойна, і таму ніхто з дзіцячага садка, што знаходзіцца на вуліцы Гагарына ў Гомелі, нават не падазраваў, што яны жывуць там. Ды толькі так было нядоўга: восы пачалі ўсё гучней заяўляць аб сабе, уяўляючы для дзятвы небяспеку. Таму кіраўнікі садка звярнуліся да работнікаў аддзялення МНС, якія і навялі парадак. А прэс-сакратар абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў паведаміў нам, што да выратавальнікаў з просьбай пазбавіцца ад гэтых няпрошаных крылатых гасцей гамяльчане звяртаюцца да чатырох разоў за дзень.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Загінулі пад плітамі...

Раніцай на малочнатварнай ферме ў вёсцы Міхалава Валожынскага раёна ў выніку здарэння пацярпела даярка і загінула 9 галоў буйной рагатай жывёлы.

Паводле звестак аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, паведамленне аб надзвычайным здарэнні паступіла каля паловы сёмай раніцы. Як высветлілася, у будынку фермы «паехала» столевае перакрыцце: 10 жалезабетонных пліт абрынуліся ўніз. У выніку даярка, жыхарка вёскі Навіны, атрымала траўмы і была змешчана ў бальніцу. Што датычыцца прычын здарэння, то, паводле папярэдняй інфармацыі, — гэта страта нясучай здольнасці пліт перакрыцця з-за парушэння нормаў нагрузкі. Цагляная ферма была пабудавана ў 1962 годзе. Праверкай займаецца пракуратура.

Ігар ГРЫШЫН.

Ашалеў тхор

Гэты выпадак зафіксаваны ў Гомелі, што здараецца не так ужо часта з указанымі звяркамі. З пачатку ж года ў абласным цэнтры на шаленства захварэлі таксама два каты і сабака.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Выстава

«Жаночы погляд», беларускі варыянт

Прычым нават тры погляды, адразу трох жанчын, прадстаўляе «Палац мастацтва».

Тры мастачкі аб'ядналіся ў адной выставе «Погляд». І ўсе тры — маладыя, таленавітыя, маюць вялікае жаданне нешта сказаць людзям праз свае творы. Але кожная — нешта сваё і па-свойму. Хоць іх сапраўды шмат што аб'ядноўвае: натхненне, закаханасць, улюбёнасць, якія адчуваюцца ў іх творах. Але яшчэ і тое, што Кацярына Сумарава, Алена Іванова, Таццяна Грыневіч прайшлі школу аднаго настаўніка. Іх дыпломнай працай у Беларускай акадэміі мастацтваў кіраваў Віталь Герасімаў. Засвоіўшы ад настаўніка, як трэба пакараць сэрцы гледачоў, маладыя мастачкі ўзяліся за працу. Свае самыя лепшыя пачуцці, самыя патаемныя думкі і шчырасць сваіх поглядаў жанчыны гатовыя раскрыць іншым. Але без лішніх слоў — праз палотны, якія прадстаўлены на вернісажы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Формула ўдачы

Прыхільнасць Мельпамены

Цёплы, вельмі цёплы Херсон аказаўся для Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. А калі больш дакладна — да яго жанчын. «Жанчын Бергмана». Менавіта гэты спектакль тэатра быў адзначаны на X Міжнародным тэатральным фестывалі «Мельпамена Таўрыі».

З Херсона беларусы прывезлі Гран-пры ад міжнароднага журы. Але дыплом за лепшую пастаноўку аддала РТБД незалежнае журналісцкае журы. Спектакль быў паказаны на сцэне Херсонскага абласнога акадэмічнага музычна-драматычнага тэатра імя М. Куліша, гледачы яго цёпла прынялі і адзначылі працу ў ім заслужанай артысткі Беларусі Таццяны Мархель, Людмілы Сідаркевіч, Ігара Сігава.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Гульня № 1

Каталонскі Глеб

Нарэшце вырашылася сітуацыя з пераходам лепшага футбаліста Беларусі — Аляксандр Глеб падпісаў асабісты кантракт з «Барселонай». Каталонскі клуб заплаціць за футбаліста £ 13,3 млн. Чакаецца, што афіцыйна іспанскі клуб абвесціць аб кантракце ў панядзелак. Кантракт разлічаны на 4 гады. Замежныя СМІ паведамляюць, што Глеб ужо знаходзіцца ў Іспаніі, дзе праходзіць медыцынскае абследаванне.

Яшчэ ў канцы мінулага сезону Аляксандрам сур'ёзна зацікавіліся міланскі «Інтэр», мюнхенская «Баварыя» і «Барселона». Апошняя і аказалася найболей настойлівай. Будучыня футбаліста на працягу апошніх двух месяцаў заставалася смутнай, і вось, нарэшце, калі не здарыцца нейкіх фарс-мажорных акалічнасцяў, ён пяройдзе ў каталонскую каманду. Некаторыя СМІ распаўсюдзілі інфармацыю, што ў Глеба, нібы, канфлікт з галоўным трэнерам «Арсенала» Арсенам Венгерам і іспанскім паўабаронцам каманды Франсэскам Фабрэгасам: маўляў, і з французскім спецыялістам у Аляксандра розныя погляды на футбол, і Сэска беларус абвінавачваў у футбольным эгаізме. Рэакцыя з'явілася неадкладна — на афіцыйным сайце самога Глеба, дзе ён піша, што «быў па-сапраўднаму шакіраваны. Я ніколі не стаў бы выказвацца аб трэнеру або калегах па камандзе ў такім тоне. Сэск ужо даўно стаў для мяне вельмі добрым сябрам, а пра Арсена Венгера і зусім не трэба шмат казаць. Ён сенсацыйны трэнер. Я вельмі многім абавязаны яму і «Арсеналу».

А малодшы брат Аляксандра — Вячаслаў — у пачатку наступнага тыдня адправіцца ў Галандыю, дзе выступіць у футбольным клубе «Рода». На працягу года ён будзе гуляць у галандскай камандзе на правах арэнды. Пасля двух паражэнняў запар футбалісты «Шахцёра» змаглі атрымаць перамогу — над «Віцебскам» з лікам 2:1. У гарнякоў стала 20 ачкоў, і яны перамясціліся на пятае месца ў турнірнай табліцы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 3672. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12